І-б. "Савецкая Беларусь" Москва, Моховая, 8 Публичной библиотеке СССР им. Ленина отд. обмен. адвін экз.

...КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ і УРАДЖАЮ"

Пралетарыі ўсіх краёў ...ystkich krajów łączcie się! ...стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня. Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦЬВЕР 15 кастрычніка 1931 г. № 239 (3328)

ПЕРАТВОРЫМ У МАСАВЫ АГЛЯД КАЛГАСНЫХ ГАСПАДАРАК,

У РАЗГОРНУТЫ ПАХОД ЗА АРГАНІЗАЦЫЮ ПРАЦЫ У КАЛГАСАХ, НОВЫ КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ, ПОЎНАЕ І ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЎСІХ АСЕНЬНІХ С.-Г. КАМПАНІЙ

Вопыт лепшых ударнікаў калгасных палёў--у кожны калгас, да кожнага калгасьніка

ДА РАШАЮЧЫХ ПЕРАМОГ

на фронце завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі ідуць саўгасы і калгасы

Да ўсіх рабочых, работніц, калгасьнікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў

АДОЗВА ЦК КП КП(б)Б

Таварышы!

Рабочая кляса Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ае ленінскага ЦК дабілася бліскучых посьпехаў ва ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Растуць і ўступаюць у строй новыя гіганты сацыялістычнай прамысловасьці, пашыраецца мэталюргічная і энэргетычная база, шпаркімі тэмпамі разьвіваецца лёгкая індустрыя. Гіганцкія посьпехі здабыты на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у справе разьвіцьця сацыялістычнага земляробства. Савецкія гаспадаркі ў бягучую вясну засявалі 8 мільёнаў гектараў. На сацыялістычных палёх Савецкага Саюзу ў сучасны момант працуе звыш 1.250 МТС. У галіне калгаснага будаўніцтва аказаліся далёка перавышанымі ўсе папярэднія пляны і намечэньні.

Па БССР калектывізавана каля 50 проц. бядняцка - сераднякіх гаспадарак, арганізавана 329 саўгасаў з па сеўнай плошчай ў 610 гект., створана 30 МТС, працуе на палёх 1.740 трактараў, пасеяна і ўбрана 240.000 гект. лёну і канапель

Наша краіна падышла да рашаючага этапу сацыялістычнага будаўніцтва —да завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Калгаснае сялянства стала асноўным вытворцам с.-г. прадукцыі і сапраўды моцнай апорай партыі і савецкай улады на вёсцы.

Гэтыя перамогі сусьветна-гістарычнага значэньня здабыты ў рэзультаце няўхільнага і пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, па літыкі суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва як клясы. Гэтыя посьпехі здабыты партыяй ў жорсткіх клясавых баёх супроць кулацтва, у няпрымірымым змаганьні супроць правых і «левых» апартуністаў.

«Дзень калектывізацыі і ўраджаю» выяўляецца днём масавага агляду посьпехаў і дасягненьняў сацыялістычнага земляробства, днём масавай праверкі выкананьня заданьняў партыі і ўраду аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Гэты дзень павінен зьявіцца магутным фактарам павышэньня вытворчай актыўнасьці ўсіх працоўных мас на яшчэ больш шпаркае разьвіцьцё сацыялістычнай эканомікі СССР, на падцягваньне тых вучасткаў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, якія адстаюць.

Перад вамі стаіць задача ўзмацняць свой пралетарскі ўплыў у сацыялістычнай перабудове вёскі. Перадавайце вопыт бальшавіцкіх тэмпаў і сацыялістычных мэтадаў працы перадавых фабрык і заводаў у падшэфныя калгасы і вёскі. Арганізуйце масавыя выезды ў «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» для дапамогі калгаснікам у іх змаганьні за новую сацыялістычную вёску. Трымайце і ў далейшым цесную сувязь з падшэфнымі калгасамі, дапамагайце ім у арганізацыі вытворчасьці, у правядзеньні мерапрыемстваў, накіраваных на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калектываў.

«Дзень калектывізацыі і ўраджаю» павінен прайсьці пад знакам узмоцненай барацьбы за выкананьне прамфінпляну, асабліва за поўную рэалізацыю праграм вырабу с.-г. машын.

Шпаркі рост, гіганцкія посьпехі калгаснага будаўніцтва патрабуюць няўхільнага ажыцьцяўленьня пастановаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб арганізацыйна - гаспадарчым замацаваньні калгасаў.

Умацаваць калгасы — гэта значыць правільна арганізаваць працу, укараніць зьдзельшчыну ва ўсіх відах работы, наладзіць яе дакладны ўлік, лік відаваць абязьлічку, вытравіць з калгаснай практыкі дробна-буржуазную ўраўнілаўку.

Барацьба зь аўладаньне агратэхнікай, за павышэньне ўраджайнасьці, за якасьць работы, за шырокае разгортваньне падрыхтоўкі кадраў сацыялістычнага земляробства зьяўляецца базавой задачай дня ўсёй грамадзкасьці.

Арганізацыйна - гаспадарчае замацаваньне калгасаў на даным этапе калгаснага будаўніцтва зьяўляецца галоўнай рашаючай задачай, практычнае вырашэньне якой вызначае сабою новыя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Разьмеркаваньне даходаў па працадзнёх — асноўнае зьвяно арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, за якое зараз трэба ўхапіцца.

Толькі на аснове разьмеркаваньня даходаў на колькасьці і якасьці працы замацоўваецца зьдзельшчына, узьнімаецца прадукцыйнасьць працы, на вышаюцца якасныя паказьнікі калгаснай вытворчасьці.

Разьмеркаваньне даходаў адбываецца ў абставінах жорсткага клясавага змаганьня. Кулацтва, зьмяніўшы сваю тактыку, бярэ курс на разбурэньне калгасаў з сярэдзіны, вядзе ўзмоцненую агітацыю за разьмеркаваньне ўраджаю па ядоцка - падушным прынцыпе. Гэтым самым кулацтва імкнецца сарваць арганізацыйна - гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Усякія праяўленьні ураўнілаўкі, адкрытай або захаванай, ЦК разглядае, як праяўленьне кулацкага ўплыву. ЦК заклікае ўсю партыйную арганізацыю, усіх калгаснікаў весьці самае бязьлітаснае змаганьне супроць ураўнілаўкі, у якім-бы выглядзе яна не зьяўлялася. Разьмеркаваньне ўраджаю павінна быць узята пад суровы грамадзкі кантроль, па вінна праводзіцца пры ўмовах няўхільнага захаваньня прынцыпу: «хто больш працуе, той больш і атрымлівае».

«Дзень калектывізацыі і ўраджаю» павінен зьявіцца магутным фактарам у справе ліквідацыі прарываў на фронце разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Неабходна ўзмацніць увагу ўсіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый да вырашэньня задач жывёлагадоўлі, асабліва сьвінагадоўлі, якая дае магчымасьць найбольш хутка вырашыць мясную праблему. Усямерная садзейнасьць пашырэньню стада, правядзеньне зоатэхнічных мерапрыемстваў, падрыхтоўка да зімоўкі жывёлы (будаўніцтва абораў і сьвінарнікаў) пашырэньне кармовай базы — вось самыя адказныя і ўдарныя вучасткі работы, куды трэба накіраваць усе лепшыя сілы рабочых саўгасаў і калгаснікаў. Паставіць жывёлу пад стрэхі, забясьпечыць яе кармамі і ў першую чаргу сакавітымі— вось задача сёньняшняга дня. Вызначаная партыяй і ўрадам праграма сіласаваньня — мільён тон сіласу—зьяўляецца мінімальнай. Ніякіх падстаў для яе скарачэньня няма. Мы можам ня, але і перавыкананьня гэтай праграмы. Ад першых посьпехаў на фронце і павінны дабіцца ня толькі выкананьне разьвіцьця жывёлагадоўлі да рашаючых перамог павінны ісьці шпаркімі тэмпамі саўгасы і калгасы.

Свячасовая ўборка і загатоўка бульбы і гародніны, апрацоўка і датэрміновая здача лёну, выкананьне плянаў загатовак збожжа, адгрузкі бульбы для Ленінграду — вакол гэтых кампаній трэба мабілізаваць усю калгасную і бядняцка - сераднякую масу вёскі. У «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» арганізуйце масавыя чырвоныя абозы лёну, збожжа, бульбы і інш. Ніводнага кілё збожжа, бульбы і гародніны прыватніку. Памятайце, што пасьпяховае выкананьне плянаў загатовак збожжа, бульбы, лёну і інш. с.-г. прадукцыі дасьць яшчэ больш магчымасьці для палепшаньня рабочага забесьпячэньня, дасьць фабрыкам і заводам сырэц для выпуску ў большых разьмерах тавараў шырокага спажываньня.

Раньняе зяблева — гэта барацьба за высокі ўраджай. Выразная ўнутрыбрыгадная арганізацыя працы ў саўгасах, МТС і калгасах, правільная расстаноўка сіл і ўмелае скарыстаньне сродкаў вытворчасьці ўзьнімаюць тэмпы сяўбы і зяблева. МТС, саўгасы і калгасы — на перадавыя пазіцыі сяўбы і зяблева!

Таварышы! Мы атрымалі буйныя перамогі, якія маюць сусьветнае гістарычнае значэньне. Мы бярэм крэпасьць за крэпасьцю ў разьвіцьці сацыялістычнай эканомікі. Наша крэпасьць на гіганцкімі крокамі рухаецца наперад па шляху сацыялізму.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікае ўсіх рабочых, калгаснікаў, бядняцка-сераднякіх масы адназасобнікаў і ўсіх працоўных пераратыць «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» ў дзень масавага агляду посьпехаў сацыялістычнага земляробства, у дзень мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў вытворчасьці на ліквідацыю прарываў, у дзень масавага паходу за падцягваньне тых вучасткаў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, якія адстаюць.

Таварышы! «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» мы праводзім напярэдадні 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, напярэдадні найвялікшага сьвята ня толькі працоўных СССР, але і ўсяго сьвету. Найлепшым падарункам да 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі будзе поўнае выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне плянаў загатовак на аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва, поўнае і неадкладнае выкананьне дырэктыў партыі па арганізацыйна - гаспадарчым замацаваньні калгасаў.

Наперад, за разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце!

За канчатковую перамогу сацыялізму!

ЦК КП(б)Б.

Слухайце наш выклік,

калгасьнікі і аднаасобнікі Магілеўскага раёну

14 гадавіна Кастрычніка павінна быць спаткана ва ўсіх куткох нашага Саюзу новым ростам тэмпаў барацьбы за выкананьне і перавыкананьне плянаў усіх праходзячых гаспадарча- палітычных кампаній

Ганьба таму калгасу, сельсавету, вёсцы, якія прыдуць да 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі з прарывамі.

Мы калгаснікі калгасу «Ударнік» і «Камуна Магілеўшчыны», Вендараўскага сельсавету, Магілеўскага раёну, разгортваем заклік аднаасобнікаў у калгасы імя 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Наш калгас «Ударнік» аб'яднае 57 бядняцка - сераднякіх гаспадарак «Камунар Магілеўшчыны» — 27 гаспадарак.

Да 15 верасьня намі скончана сяўба азімых з перавыкананьнем плянавых заданьняў: на 8 кастрычніка г. г. выкананы на 130 проц., па калгасу «Уданік» і на 100 проц. «Камунар Магілеўшчыны». Апроч таго, калгас «Камунар Магілеўшчыны» на 8 кастрычніка здаў дзяржаве 50 тон бульбы. Калгас «Ударнік» адгрузіў вагон бульбы Ленінграду.

Мы абавязваемся да «Дню калектывізацыі і ўраджаю» поўнасьцю закончыць уборку бульбы і выканаць плян па здачы лёну да 1-га лістапада, поўнасьцю скончыць апрацоўку лёну (з плошчы 9 га калгас «Ударнік» і 4,7 га «Камунар Магілеўшчыны»), і здаць добраякаснага валакна дзяржаве не пазьней 1 лістапада, плян па ворыве зябу выканаць да 20 кастрычніка.

У «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» нашы калгасы абавязваюцца паслаць у Хонаўскі сельсавет брыгады калгаснікаў для правядзеньня масава - растлумачальнай работы па ўцягненьні бядняцка - сераднякіх гаспадарак у калгасы. Абавязваемся да 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ўцягнуць у калгасы ня менш аднэй бядняцка - сераднякай гаспадаркі на кожнага калгасніка з нашых калгасаў.

Таварышы калгаснікі і аднаасобнікі Палыкоўскага, Дасовіцкага і Дабрасьневіцкага сельсаветаў, у нас хлебазагатоўкі ідуць нявольніцкімі тэмпамі. Таварышы калгаснікі і аднаасобнікі Рафалаўскага, Таранаўскага, Грыбянеўскага і Машанацкага сельсаветаў, вы павінны неадкладна дабіцца баявых тэмпаў уборкі і загатоўкі бульбы. Таварышы аднаасобнікі — беднякі і сераднякі Палыкаўскага сельсавету, вы ганебна адстаеце ў перабудове сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад. Процант калектывізацыі ў вас недапушчальна нізкі. Неадкладна ўзмацніце барацьбу з кулацтвам і яго агентурай, арганізуйце ім сьмяротны ўдар, падрыхтуйце спатканьне 14 гадавіны Кастрычніка магутным прылівам у калгасы.

Мы калгаснікі калгасу «Ударнік» і «Камунар Магілеўшчыны» заклікаем усе калгасы неадкладна арганізаваць ударныя брыгады па папулярызацыі дасягненьняў калгаснага будаўніцтва сярод беднякоў і сераднякоў суседніх вёсак, вярбуйце новае магутнае папаўненьне ў калгасную армію. Кожны калгас на сходах аднаасобнікаў і праз друк павінен арганізаваць паказ сваіх дасягненьняў.

Калгаснікі калгасу «Ударнік» і «Камунар Магілеўшчыны».

Дэкаднік сьвята правесьці па-ўдарнаму

ЕЛЬСК. (Па тэлефону ад наш кар.). 11 кастрычніка адбылася вытворчая нарада па пытаньні падрыхтоўкі да «Дню калектывізацыі і ўраджаю», у якой прыняло ўдзел 85 дэлегатаў ад калгасаў і сельсаветаў.

Нарада пастанавіла ў дэкаднік сьвята ўраджаю і калектывізацыі правесьці наступныя мерапрыемствы:

Правесьці справаздачы калгасаў аб сваіх дасягненьнях на бядняцка-сераднякіх сходах аднаасобнікаў;

разгарнуць работу па 2-х месячніку жывёлагадоўлі;

У бліжэйшыя дні закончыць уборку бульбы і поўнасьцю выканаць плян па адгрузцы яе ў пралетарскія цэнтры.

Усямерна эмагацца за павялічэньне ўраджайнасьці, за падняцьце зябу, за арганізацыйнае замацаваньне калгасаў, правесьці шырокую распрацоўку дакладу тав. Якаўлева.

На правядзеньне сьвята калектывізацыі і ўраджаю ў сельсаветы выяжджае камісія ЦК КП(б)Б і адказны сакратар РК КП(б)Б тав. Геўрасеў.

Герасіменка.

Прэміі лепшым калгасам

Гатоўскі сельсавет і партячэйка паўдарнаму здолелі арганізаваць работу па ўборцы, асеньняй сяўбе як у калгасах, так і сярод аднаасобнікаў. Уборка яравых закончана ў калгасах да пачатку сяўбы.

Асеньняя сяўба пачалася свячасова і да тэрміну скончана. Першым за кончыў сяўбу азімых калгас «Чырвоны партызан». Усе калгасы вызначылі фонды прэм'яваньня лепшым калгасьнікам у правядзеньні ўборкі і асеньняй сяўбы. Гэтыя прэміі будуць выданы ў «Дзень калектывізацыі і ўраджаю».

Бярозаў.

Факты бальшавіцкай перамогі

(Веткаўскі раён, Радугскі сельсавет)

Калгас «Чырвоны баец» арганізаваўся ў пачатку 1930 г. З першых дзён у калгасе былі некаторыя непаразуменьні, але ў працэсе работы гэтыя ўсе недарэчнасьці былі выкінуты. Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву і правільнай арганізацыі працы, перамога засталася за калгасам. Беднота і сераднята вакольчых вёсак уступілі ў новаарганізаваны калгас.

Калгас набыў збожжавы напрамак і з пастаўленымі задачамі перад гэтай гаспадаркай пасьпяхова спраўляецца. У гэтым годзе калгасу трэ' было засеяць 100 га аз'мых, але калгас высуваў сустрэчны плян і засеяў 132 га. Уборка ўраджаю скончана свячасова Узор работы калгаснікаў быў прыкладам для аднаасобнікаў. Калгасьнікі працавалі з раніцы да вечэра без выхадных дзён. Уборку ўраджаю калгас праводзіў разгарнуўшы сацспаборніцтва паміж брыгадамі. Абязьлічка да конскай цягавай сілы была ліквідавана. Усе коні замацаваны. Па ліквідацыі абязьлічкі да коняй заключана сацумова з саўгасам «Новасёлк». Гэта умова выконваецца, як з адчаго, так і з другога боку.

Уся праца ў калгасе пераведзена на зьдзельшчыну. У выніку зьдзельшчыны значна павысілася прадукцыйнасьць працы з таксама павысілася і выпрацоўка працадзён. Працыцыплі на ў калгасе пастаўлена на належную вышыню, прагулы ліквідаваны. Прагулы зьнішчаны шляхам грамадзкага ўзьдзейнічаньня на прагульшчыкаў.

Плян сіласаваньня калгасам перавыкананы—засіласавана зяленага корму 60 тон.

Зараз калгас па баявому працоўцы ў уборку бульбы. У калгасе засеяна бульбай 111 га; выбрана на сёньняшні дзень каля 70 га. На гэты вучастак працы мабілізавана ўся маса калгасьнікаў з тым каб да 15 кастрычніка плян уборкі цалкам выканаць. Уборка бульбы праходзіць зьдзельна. На 1 га ставіцца 20 жанчын, але ў выніку сац спаборніцтва і ўдарніцтва нормы перавыконваюцца.

Калгас здае дзяржаве 14 тон збожжа, таксама ў ліквідэшы час будзе здака 250 тон бульбы.

Пры калгасе ёсьць сьвінная фэрма. На сёньняшні дзень пастаўлена каля 70 сьвіноматак. За сьвіньнямі ўстаноўлен галежны догляд. Сьвіньні замацаваны за адпаведнымі сьвінаркамі, якія ўвесь час і даглядаюць іх.

Малочная фэрма калгасу складаецца з 29 кароў, дзе справа пастаўлена таксама добра.

У калгасе строга эконом'цца корм. Усе кармы ўзяты на вучот і выдаткуюцца па цьвёрдых нормах дачы.

Трэба адзначыць, што ў калгас слаба працуюць нарады. За летні час вытворчая нарада зьбіралася толькі 2 разы.

Справа культурнага выхаваньня так сама кульгае, за ўсё лета выпушчана толькі 3 нумары насьценнай газэты і 4 палявых лісткі: На перабудову работы нарад цяпер зьвяртка належная ўвага і праца пачынае ажывіць. Зараз у калгасе праходзіць аўтоцкі прыбытку і падрыхтоўка да разьмеркаваньня ўраджаю. Пачатак гэтай працы ўзяты правільна і трэба чакаць, што ў «Дзень калектывізацыі і ўраджаю калгас свэім даходам арганізуе новы прыліў у калгас.

П. Х. В.

Сьвята перамог

На Аршанскім раёне разгарнулася шырокая работа да «Дню калектывізацыі і ўраджаю». Ва ўсіх сельсаветах арганізаваны камісіі па правядзеньню сьвята. Праведзены нарады калгаснікаў, дырэктараў саўгасаў, прафаргані зацый па пытаньні правядзеньня сьвята.

Паводле пляну сьвяткаваньня «Дню калектывізацыі і ўраджаю» па Аршанскім раёне—на працягу з 14 па 25 кастрычніка—будзе праведзена 6 сельска-гаспадарчых куставых выставак, з якіх тры па ільнаводству, дзьве па жывёлагадоўлі і адна па садоўніцтву і гародніцтву. Удзел у выстаўках прымуць саўгасы, калгасы, бядняцка-сераднякія гаспадаркі аднаасобнікаў, школы, ШКМ і г. д. Для прэм'яваньня лепшых дасягненьняў, мерапрыемстваў па рацыяналізацыі, па вынаходніцтву Райвыканком, Райкалгассаюз, Райсадсаюз і Райспажыўсаюз вылучаюць спэцыяльныя фонды. Прэміі будуць выданы грашыма, рэчамі, дыпломамі, пасылкай на вучобу. Шырокі ўдзел у выстаўках прыме МТС.

У час сьвята будуць арганізаваны масавыя экскурсіі ў лепшыя саўгасы і калгасы, будзе праведзена праверка выкананьня ўмоў па сацспаборніцтву, вытворчых плянаў, правядзеньня вядзельшчыны, уліку працы, разьмеркаваньня даходаў, выдачы авансаў калгасьнікам. Будзе праведзена шырокая кампанія справаздачнасьці МТС, калгасаў па шырокіх сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў аб папярэдніх выніках работы па ўборцы, асеньняй сяўбе.

Таксама па працягу ўсяго сьвята па раёне будзе праведзена 7 куставых сходаў калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў для абгаварэньня далейшых задач папярэдніх вынікаў калгаснага будаўніцтва, разьвіцьця жывёлагадоўлі, садоўніцтва, гародніцтва і тэхнічных культур.

Райкалгассаюз мяркуе вылучыць пяць лепшых калгасьнікаў на кіруючую работу ў раённых установах і арганізацыях, аднаго—ў цэнтральныя ўстановы і 30 калгасьнікаў перакінуць са старых калгасаў у новыя для перадачы вопыту і наладжаньня там работы. Будзе таксама праведзена работа па вярбоўцы калгасьнікаў на завочнае навучаньне.

Шэфы мяркуюць разгарнуць работу па аказаньні дапамогі сваім падшэфным калгасам ,а прафсаюзныя арганізацыі—ўзмацненьня шэфства над саўгасамі і калгасамі.

Уся работа па правядзеньні сьвята ўраджаю і калектывізацыі будзе цесна ўвязана з усімі важнейшымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, якія зараз праводзяцца на вёсцы.

А. Кудрын.

ЗА ЧЫРВОНУЮ КНІГУ САВЕТАЎ!

Вялізарнейшыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады патрабавалі карэннай перабудовы саветаў і ўсіх савецкіх органаў такім чынам, каб яны сапраўды павярнуліся тварам да вытворчасьці, тварам да калгаснага руху.

Гэтая перабудова павінна ўзьняць ролю саветаў як актыўных праваднікоў генэральнай лініі партыі, «...толькі на грунце сапраўдны незамірнай барацьбы з праваапартуністычнай практыкай, дагэтуль яшчэ нярэдкай, ня толькі ў мясцовых саветах, але часткова і ў цэнтральных органах дзяржапарату можна і бязумоўна патрэбна ўзьняць работу саветаў у практычным правядзеньні генэральнай лініі партыі на ўсім сацыялістычным будаўніцтве» (з паст. аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)).

Прайшоў амаль год з часу сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), амаль год з таго часу, як быў прыняты гістарычны, важнейшы палітычны дакумант партыі ў галіне савецкага будаўніцтва. Працаваць па-новаму, ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце патрабавалі такой перабудовы работы, якая можа быць праведзена «... толькі на грунце ўзьняцьця ролі саветаў, як праваднікоў генэральнай лініі партыі, незамірна варожых, як ў адносінах правага, так і ў адносінах «левага» апартунізму. (З паст. сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)).

За гэты час рабочая кляса і калгаснае сялянства дамагліся новых посьпехаў, новых перамог у сацыялістычным будаўніцтве краіны саветаў.

Адзін за другім уступілі і ўступаюць у строй волаты з ліку 518 фабрык і заводаў і 1040 машынна-трактарных станцый, магутнай хваляй пашырэецца калгасны рух, зьмятаючы на сваім шляху ўсякія перашкоды, апартуністычныя рагаткі, ліквідуючы на грунце суцэльнай калектывізацыі кулацтва як клясу.

Разам з гэтымі на аснове гіганцкай будоўлі растуць і мацнеюць, рашуча перабудоўваючы сваю работу, органы дыктатуры пралетарыяту—саветы.

Шмат прыкладаў сапраўды ударнай работы паказалі саветы ў часе другой бальшавіцкай сяўбы і ўборкі. Шмат сельскіх і гарадзкіх саветаў рыхтуюць і зараз рапарты аб новых перамогах да 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, выкананьнем плянаў збожжазагатовак, мабілізацыі сродкаў і інш.

На радзе буйнейшых прадпрыемстваў арганізаваны дэпутацкія групы, якія аб'ядноваць у весь савецкі актыў, вядуць самаадданую барацьбу за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Вопыт іх барацьбы за сацыялізм, практыка перабудовы іх работы не пераданы шырокім працоўным масам, ня стаў яшчэ здабыткам кожнага рабочага, калгасьніка, бедняка і серадняка. Гэтую задачу і павінна выканаць **«Чырвоная кніга сацыялістычных рапартоў саветаў»**, якую мы прапануем выпусьціць і бярэм на сябе яе арганізацыю.

У «Чырвонай кнізе саветаў» павінен знайсьці месца кожны гарадзкі сельскі савет, сэкцыя і дэпутацкая група, якія пакажуць сапраўды бальшавіцкія ўзоры ў чацьвёртым рашаючым квартале 3-га рашаючага году пяцігодкі, якія сапраўды перабудавалі сваю работу тварам да вытворчасьці і калгаснага будаўніцтва.

Асноўнай умовай для ўключэньня ў «Чырвоную кнігу саветаў» павінна будзе зьявіцца выкананьне праграмы мінімуму, якая пакладзецца ў грунт усёй нашай далейшай работы ў чацьвёртым квартале і будзе гэтымі днямі апублікавана. Праграма мінімуму прадугледзіць для сельскага савету поўнае выкананьне плянаў загатовак збожжа, рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага», здачы ўсіх таварных лішак калгасамі—да 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Поўнае выкананьне гадавых плянаў іншых загатовак, мабілізацыі сродкаў, спагнаньне дабраахвотных і абавязковых плацяжоў, разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах і іх арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне і інш.—да ўступленьня ў чацьвёрты заключны год пяцігодкі.

Разам з гэтым павінны быць праведзены канчатковая арганізацыя і афармленьне дэпутацкіх груп у буйнейшых саўгасах і калгасах, ажыўленая работа сэкцый сельсаветаў.

Гэтая работа, якая цесным чынам увязваецца з правадзімым аглядам работ і справаздачнай кампаніяй саветаў, павінна справаджацца ўцягненьнем шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў у непасрэдную работу саветаў і іх сэкцый.

Гэтая-ж праграма мінімуму будзе прадугледжваць і пэўныя абавязкі для гарадзкіх саветаў, дэпутацкіх груп і сэкцый.

Важнасьць гэтай прапановы відавочна. Яна з аднаго боку мабілізуе шырокія масы на хутчэйшае выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных задач, а з другога дасьць магчымасьць сыстэматызаваць вопыт і практыку савецкай работы, стварыць настольную кнігу для кожнага савецкага актывіста.

Зусім зразумела, што посьпех гэтай кампаніі будзе залежыць ад таго, на колькі партарганізацыі, савецкі актыў, цэнтральны і раённы друк і ўся грамадзкасьць мабілізуюцца на яе правядзеньне, пакажуць і ў гэтым сапраўды бальшавіцкія тэмпы і настойлівасьць.

Адзіным фронтам уключыцца ў арганізацыю «Чырвонай кнігі сацыялістычных рапартоў саветаў»! Да 4-га за ключнага году пяцігодкі прысьці з новымі перамогамі!

Шлях калгасу імя Дзяржынскага--

шлях перамог калектыўнай гаспадаркі

У сакавіку месяцы 1928 г. у былым маёнтку арганізаваўся першы на Клічаўшчыне калгас імя Дзяржынскага.

Спачатку гаспадарка разьвівалася вельмі марудна, ня было дастатковых сродкаў, бо ў калгас уступілі адны батракі. Для арганізаваўшагася калгасу дастаўся толькі адзін двухпавярховы дом і больш ніякай будоўлі ня было. Зусім адсутнічалі машыны, цягавая сіла і ўвесь патрэбны інвэнтар. Але калгас складаючыся з моцнага ядра, здолеў перамагчы ўсе труднасьці і ў выніку стараннасьці калгаснікаў, пры поўным уразуменьні неабходнасьці разьвіцьця калгаснай гаспадаркі, калгас імя Дзяржынскага пачаў хутка мацнець і расьці. Калгас набыў патрэбныя машыны і будоўлю. У гэтым значна дапамог сельсавет і мясцовая партячэйка. Арганізаваны калгас з 6 батрацкіх сем'яў поўнасьцю апраўдаў сябе і заваяваў аўтарытэт у вачох аднаасобнага батрацка-бядняцкага і сераднякога сялянства. даказаў перавагу калектыўнай гаспадаркі. Усе гэтыя дасягненьні спрыялі масаваму прыліву ў калгас, які хутка папаўняўся за лік батрацка-бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак. На сёньняшні дзень мы маем моцную сацыялістычную гаспадарку. Калгас мае жывёлагадоўчы ўхіл. У гэтым годзе плян пад азімыя павялічан на 50 проц. супроць мінулага году. Калгас першым справіўся з уборачнай кампаніяй, асеньняй сяўбой. Свячасова ўбрана яравое збожжа, сенажаць, гародныя культуры. Засіласавана дзьве ямы зялёнага корму. За бягучы год пабудавана калгаснае гумно, абора для жывёлы і інш. будынкі. У калгасе разгорнута пчалярства і садоўніцтва Дзякуючы правільнаму догляду за садам ён дае калгасу прыбытак больш 3-х тысяч руб. у год. Гэтых перамог калгас дабіўся дзякуючы правільна пастаўленай арганізацыі працы, пераводу ўсіх работ на зьдзельшчыну, сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Лепшымі ўдарнікамі калгасу зьяўляюцца Ермаліцкі Антось, Сушынкі Ўладзімір, Рэвінская Ніна, Зайцава Наталья. Штэйнэр Амалія.

Старшыня калгасу Цьвілікевіч, рабочы з 25 тысячнікаў ён таксама ў вольны час ідзе поплеч з усім на працу, ня гледзячы на сваю перагружанасьць і нават нясе чарговую варту ў начны час па калгасу. Культурна-выхаваўчая праца ў калгасе пры дапамозе Бацэвіцкай партячэйкі і мясцовай партгрупы праводзіцца ў дастатковай меры. Маецца клюб і ленінскі куток, дзе праводзяцца розныя даклады і палітвыхаваўчая работа. Крытыка і самакрытыка разгорнута дастаткова.

Усё гэта спрыяла штодзённаму масаваму прыліву ў калгасы.

З усім гэтымі дасягненьнямі калгас імя Дзяржынскага сустракае «Дзень калектывізацыі і ўраджаю».

Шлях калгасу імя Дзяржынскага,— шлях перамог калектыўнай гаспадаркі.

Сачыўка



Бульба для адгрузкі рабочым цэнтрам.

ЯПОНСКІ ІМПЭРЫЯЛІЗМ,

прыкрываючыся дыплёматычнай перапіскай, замацоўвае свае пазіцыі ў Манчжурыі

Я онія супярэчыць умяшацельству каго-небудзь у кітайска-японскі канфлікт

Адказ Японіі на ноту Лігі Нацый

ТОКІЁ, 13-X. У сваім адказе лігі нацый, пасланым учора японскаму прадстаўніку ў Жэнэве Ёсізаве,— японскі урад падкрэсьлівае і лічыць, што канфлікт можа быць вырашан і ў адавальняючым сэнсе толькі ў непасрэдных перагаворах паміж Японіяй і Кітаем.

У японскай ноце далей гаворыцца, што ваенныя дзеяньні японскага войска ў Манчжурыі ў сучасны момант у агульным скончаны і што японскі ўрад не знаходзіць ніякіх адзнак не нармальнага становішча ў Манчжурыі. Перасоўваньне японскага войска ў розныя раёны, прылягаючыя да зоны Паўднёва-Манчжурскай чыгункі, выклікалася неабходнасьцю абароны карэйскага насельніцтва.

Інцыдэнт у Цзыньчжоў неабходна ацэньваць, як дробную падзею. Японскі урад лічыць памылковым, што падзею ў Цзыньчжоў імкнуцца ізаляваць ад усіх абставін і меркаваць, што яна прывядзе да абвостраньня становішча ў Манчжурыі. Паведамленьне, нібы становішча абвострылася дзякуючы адпраўцы японскіх ваенных судоў на Яцзы, не адпавядае сапраўднасьці. Наадварот, сам Кітай ускладняе сітуацыю, дапускаючы антыяпонскі рух у Кітаі і ў Манчжурыі.

Японскі урад выказаў выклікае цярпеньне паслаў свае ваенныя судны толькі для абароны японскіх грамадзян. Японская нота асабліва падкрэсьлівае, што «гэты крок зусім адпавядае працэндэнтам, устаноўленым іншымі дзяржавамі ў падобных-жа абставінах». Становішча Манчжурыі ў сучасны момант гэткае, што надзвычай ка затрудняе аднаўленьне там парадку, ня толькі ў Манчжурыі, але нават і іншых частках Кітаю, дзе узрастае пагроза жыцьцю і маемасьці японскіх грамадзян. Гэта вымушае японскі урад накіраваць туды новыя ваенныя судны.

У заключэньне ў японскай ноце зазначаецца, што японскі урад лічыць найбольш неадкладнай задачай японскага і кітайскага ураду зьмякчыць варожы настрой у сваіх краінах. «Не абходна дасягнуць,—гаворыцца ў заключэньне,—згоды паміж Японіяй і Кітаем на некаторых агульных прынцыпах, якія павінны стаць базай для аднаўленьня нармальных узаемаадносін паміж абодвымі краінамі. Пасьля заключэньня гэткай згоды японскае войска спакойна можа зьвярнуцца на зону Паўднёва-Манчжурскай чыгункі.

МУКДЭН, 12-X. Японскія крыніцы мусуюць паведамленьні аб выпадках «бандытызму» у раёне Дугляо—чыгункі.

У Шанхайгуане настрой японскіх рэзыдэнтаў ўсё больш трывожны. Японскае консульства ў Таньцзыне прапанавала ўсім японскім рэзыдэнтам гораду падрыхтавацца да эвакуацыі. Далей японцы распаўсюджваюць чуткі аб канцэнтрацыі 65 тысяч кітайскіх салдат у Цзыньчжоў.

Аб ліквідацыі абязьлічкі вагонаў

Загад Народнага Камісара шляхоў зносін СССР

Пытаньні барацьбы з абязьлічкай вагоннага парку, захаванасьці вагонаў і мерах, падвышаючых эфэктыўнасьць іх выкарыстаньня, робіцца ў сучасны момант такой-жа цэнтральнай праблемай работы транспарту, як і барацьба з абязьлічкай паравозаў у перыяд зімовых труднасьцяй леташняга году.

Існуючая зараз абязьлічка таварных вагонаў (вагоны не прымацаваны да дарог, пры пераходзе з дарогі на дарогу няма ні толькі тэхнічнага агляду вагонаў з боку прымаючай дарогі, але і практыкуецца сыстэма очкаўціраецьльства з боку здаючай дарогі, якая імкнецца сплавіць хворы вагон на другую дарогу (як правіла, ліквідаваны рамонтныя пункты ў месцах абмену) прыводзіць да адсутнасьці зацікаўленасьці і клопатаў дарог аб своячасовым рамонце вагонаў і да зруйнаваньня вагоннага парку.

Выходзячы з неабходнасьці безадкладнай ліквідацыі гэткіх безгаспадарчых адносін да вагонаў, загадваю:

1. Кіраўніцтву эксплёатацыі разам з дырэкцыямі дарог разьмеркаваць вагонны парк паміж дарогамі, прымацаваўшы да іх вагоны ня толькі ў колькасным іх вылічэньні, але і па номерным вучоту, усклаcьці на дырэкцыю дарог поўную адказнасьць за стан вагоннага парку, прымацаванага да данай дарогі. Перанумарацыя і прымацаваньне вагонаў павінны быць закончаны да 15 лістапада гг.

2. Кіраўніцтву эксплёатацыі — вызначэньне інвэнтарнага вагоннага парку кожнай дарогі закончыць у пяцідзённы тэрмін. Арганізацыю пунктаў абмену і двухбаковага тэхнічнага і камэрцыйнага агляду вагонаў кіраўніцтву цягі скончыць і ўвесьці поўнасьцю дзеяньне да 1 сьнежня г. г.

3. Апэрацыі, зьвязаныя з перадачай вагонаў, не павінны весьці за сабой павялічэньне існуючых норм прастою цягнікоў у пунктах перадачы. Арганізацыя перадатачных пунктаў павінна быць праведзена без павялічэньня існуючых на дарогах штатаў, прычым кожная дарога павінна вылучыць на перадатачныя пункты найбольш кваліфікаваных спэцыялістаў-вагоньнікаў.

4. Кіраўніцтву цягі і дырэкцыі дарог базадкладна пачаць на дарогах прывязьненьне вагоннага парку ў нармальны тэхнічны стан, адбор і папярэдняе навучаньне кадраў, тэхнічную арганізацыю і прыстасаваньне абменных пунктаў, падрыхтоўку жылля для пэрсаналу і забясьпячэньне пунктаў тэхнічнага агляду рамонтнымі сродкамі і матар'ялямі.

5. Для скарачэньня часу тэхнічнага агляду і неабходнага бягучага рамонту на пунктах перадачы з дарогі на дарогу арганізаваць бягучы рамонт у часе сьледваньня цягнікоў пры стаянках на станцыях і разьездах, стварыўшы для гэтага спэцыяльныя рамонтныя брыгады.

6. Кіраўніцтвам эксплёатацыі і цягі арганізаваць безадкладна ў 3-х пунктах вопытную тэхнічную і камэрцыйную перадачу вагонаў і правесьці на іх папярэднюю праверку ўсіх намячаемых мерапрыемстваў.

Наркамшляхоў А. Андрэеў.
Масква. 13 кастрычніка 1931 г.

Яшчэ адзін „спаситель"

Францускі радыкальны дэпутат Байо высоўвае плян ратаваньня капіталізму ад крызісу стварэньнем пан-эўрапэйскага капіталістычнага блёку супроць СССР (З газэт).

Мал. М. Асота



Японскае войска рыхтуецца да захопу новых тэрыторый

ТОКІЁ. 13-X. «Ніцы-Ніцы»—паведамляе, што з прычыны абвостраньня становішча ў Кітаі вайсковa-морская ўлада аддала ўчора загад 13-му атраду зьнішчальнікаў быць гатовым да адплыцьця.

У атрад уваходзяць і судны. Адначасова адданы загад аб прыядзеньні ў гатоўнасьць да адплыцьця крэйсэра «Охт» і 18-му атраду зьнішчальнікаў.

Паводле паведамленьня Сімбун Рэнга, начальнік японскага гарнізону ў Цзяньцзіне накіраваў у Шанхай Гуань (дзе, паводле апошніх вестак японскага друку з Мукдэна, згрупоўваецца войска Чжан-Сюэ-Ляна) японскі атрад.

Паводле паведамленьня японскай вайсковай улады з Мукдэну, у мясцовасьці, што знаходзіцца ўдоўж Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі паслана японскае войска.

Праграма замацаваньня акупацыі Манчжурыі

ШАНХАЙ, 11-X. Кітайскі друк распаўсюджае весткі, што Японія высуне да наступныя патрабаваньні цяперашняй мукдэнскай ўладзе:

1) У Манчжурыі і Манголіі заснуецца «незалежны» урад». 2) Усе кітайскія чыгункі ў Манчжурыі перадаюцца пад кантроль Паўднёва-Манчжурскай чыгункі. 3) Гарады Інькоў, Аньдун, Ночжуан, Хайчэн, Мукдэн і Чанчунь аддаюцца Японіі. 4) Карэйцы, якія зьяўляюцца японскімі грамадзянамі, атрымліваюць права пасяленьня, уладаньня нярухомай уласнасьцю і консульскай абаронай ва ўнутраных раёнах Гірыньскай і Мукдэнскай правінцыі. У Гірыньскай і Мукдэне раскварты раваньне кітайскіх вайсковых часьцей не дапускаецца. Там павінны знаходзіцца толькі паліцэйскія атрады.

Выступленьне Чан-Кай-Шы

ШАНХАЙ, 12-X. Сёньня Чан-Кай-Шы выступіў з прамовай ў якой гаварыў аб стварыўшымся палітычным становішчы. Чан-Кай-Шы заявіў, што калі ліга нацый ня зможа спраўціцца з гэтым пытаньнем, Кітай возьме яго ў свае рукі.

БРЫГАДЫ, У БОЙ

ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ДРОВА-ЛЕСАЗАГАТОВАК

Горацкі, Гомельскі, Клічаўскі, Чэрыкаўскі і Чачэрскі леспрамгасы ня выконваюць пляны па вывазцы лесу і дроў

Рабселькоры! Бярэце работу леспрамгасаў пад свой неп срэдны нагляд. Змагайцеся за брыгадны мэтад працы ў лесе, за поўны перавод лесазагатовак на гаспадарчы разьлік, за мэханізацыю, за ліквідацыю ўраўнілаўкі і абязьлічкі

Узмацніць вывазку лесу

Пачалася гарачая работа па возцы драўніны на прыстанях. Арганізаваная брыгада сплаўшчыкаў на чале з дзясятнікамі прыстаняй змагаецца за перавыкананьне пляну сплаву.

Але на вялікі жаль, гэта работа зрываецца, дзякуючы чарапашым тэмпам вывазкі драўніны да прыстаняй леспрамгасамі.

На 20-га верасьня леспрамгасамі падвезена дзелавой драўніны 67 проц. агульнага пляну гадавога заданьня. З гэтай колькасьці пушчана сплавам 91 проц. да пушчанага і 63 проц. да агульнага пляну. Прыбыла і здана 85 проц. да пушчанага, 57 проц. да агульнага пляну.

З дровамі для гораду таксама справа абстаіць ня лепш. На гэты дзень леспрамгасамі падвезена да прыстаняй 142650 к. м., або выканана толькі 63 проц. агульнага пляну, прыбыла баржамі і здана гораду толькі 106.520 к. м., або выканана 74 проц. да падвезенага і 51 проц. да агульнага пляну. Гомельскаму дзяржпараходству патрэбна яшчэ перавесьці дроў гораду 103.480 к. м., леспрамгасам трэба падвесьці да прыстаняй яшчэ 56.350 к. м.

Лесазаводы, фабрыкі б'юць трывогу. Днепрабуд чакае лесаматарыялаў, горад таксама чакае апалу, але апартуністычныя тэмпы вывазкі з боку леспрамгасаў і няўважлівыя адносіны РВК зрываюць выкананьне праграмы сплаву.

Леспрамгасам Горацкаму, Чэрыкаўскаму, Клімавіцкаму, Чачэрскаму, Рэчыцкаму і Гомельскаму патрэбна ўзмацніць вывазку, асабліва па вярхоўях р. Сожу і Бесядзі, бо час не чакае.

Даманаў, Хайнеўскі.

Улічыць вурокі мінулай зімы

Забясьпечыць рабочых-плытагонаў

На лесасплаве у БССР ня ўсё добра. На 1-га кастрычніка знаходзіцца на вадзе 35 тыс. куб. мэтраў лесаматар'ялу, якія павінны прыплысьці да заводаў пад выгрузку. Часу пакуль замерзьне вада засталося вельмі мала. Згодна распараджэньня ураду, лесасплаў павінен закончыцца да 15 кастрычніка 1931 г.

Мясцовымі арганізацыямі зварочваецца вельмі мала ўвагі лесасплаву ў раёне ракі Прыпяці, у Мазыршчыне. Там самая вялікая колькасьць лесаматар'ялаў знаходзіцца на вадзе. Каб своячасова лес прыплавіць, патрэбна напружаная ўвага як лесасплаўчых арганізацый, так і мясцовых органаў. Між тым, існуе непаваротлівасьць у забясьпечаньні рабочых-плытагонаў у самы адказны момант сплаву.

Ня гледзячы на тое, што ў лесасэкцыі Белкаапсаюзу ляжаць на складах тавары, усё-ж такі яны не прасоўваюцца ў нізы і Лесбелу прыпалося ў сілу неабходнасьці, рабіць лішнія выдаткі. Напрыклад, перавезьці са складу Белкаапсаюзу на склад Лесбелу і адпраўляць гэтыя тавары багажом, каб даставіць іх спажыўкупплытагону на месца. Гэта гаворыць за тое, што Лессэкцыя Белкаапсаюзу не спраўляецца са сваімі задачамі. У той час, калі тавары ёсьць, іх не дастаўляюць сплаўшчыкам.

Выгрузка лесу ідзе вельмі марудна асабліва на заводзе «Пралетары» на рэчцы Прыпяці. Ня лепш абстаіць справа і ў другіх мясцох,

Гл—ц.

Лесбел бясплянава дасылае прамтавары, чым зрывае лесазагатоўкі

СЛУЦАК. (Наш кар.). За апошні час выкананьне гадавога пляну Слуцкім леспрамгасам усіх відаў загатовак і вывазкі лесу пасунулася наперад.

На 1 кастрычніка гадавы плян загатоўкі будаўнічага лесу выкананы на 71,9 проц., а па дровах—на 60,7 проц. Па вывазцы будаўнічага лесу—52,4 проц., вывазцы дроў—97 проц. Праўда, сюды ўжо ўключаны і дадатковы плян на 4-ты квартал.

Але-ж улічваючы ўсю важнасьць загатовак, і асабліва вывазкі лесу,— такія лічбы зусім не атэстуюць працу леспрамгасу са становучага боку.

Між тым, усе магчымасьці для пасьпяховага выкананьня пляну ёсьць. І ўсе гэтыя магчымасьці знаходзяцца цалкам у руках райвыканкому, які, дзякуючы сваёй пасыўнасьці да справы лесавывазак, не скарыстоўвае маючайся магчымасьці.

Райвыканком нічога не зрабіў, толькі вызначыў сельсаветы і ўвёў у іх гужпавіннасьць па вывазцы лесу.

Леспрамгас, страціўшы надзеі на дапамогу, арганізаваў работу па заключэньні ўмоў з калгасамі на загатоўку і вывазку лесу.

Але гэтага мала. Тут патрэбна самая актыўная дапамога ня толькі з боку РВК, але і наогул усіх арганізацый раёну, бо ўсе яны знаходзяцца на самазабесьпячэньні апалам. Нажаль, самазабесьпячэньне праходзіць зусім нездавальняюча.

Саюзныя арганізацыі і Гарсавет не разгарнулі належнай працы па пасылцы брыгад рабочых, служачых і працоўных гораду на загатоўку апалу. Аб гэтым красамоўна гаворыць лічба загатоўкі ўсяго 7000 куб. мэтраў дроў.

Шмат якія прадпрыемствы і арганізацыі зусім ня цікавяцца загатоўкай дроў, гаворачы: «самазагатоўка не дае вынікаў, яна сябе не апраўдала».

Адзначаючы недахопы ў працы Слуцкага леспрамгасу, патрэбна паказаць яшчэ адну прычыну, якая зьяўляецца амаль галоўнай у марудным выкананьні пляну.

Трэст Лесбел ня высылае ў плянавым парадку прадуктаў харчаваньня і прамтавараў. На трэці квартал ён даслаў іх толькі на 18.000 рублёў. Рэшту тавараў павінны былі дасласьць на 6750 руб., а даслалі ўсяго на 275 р.; масла павінны былі дасласьць на 930 р., а не даслалі нічога, цукру на 1620 р., а даслалі на 315 руб.

Рагачэўскаму леспрамгасу даслалі столькі лішніх прадуктаў, што апошні прывёз у Слуцкі райпрайсаюз на абмен, скрынку мыла, 2 скрынкі махоркі і 6 скрынак кансэрсаў.

У гэты-ж час Чырвона-Слабодзкі леспрамгас затрымлівае сплаў лесу толькі таму, што ня мае прадуктаў і, у прыватнасьці, ніводнай банкі кансэрсаў. Гэта ў той час, калі Слуцкі леспрамгас адчувае вострую патрэбу ў махорцы, прадуктах і ў мыле.

Пасьля такіх фактаў дзіўным становіцца тое, што Слуцкі леспрамгас атрымаў «сур'ёзную» адносіну ад Лесбелу аб тым, што ў іх злачыннае затаваранье прамтавараў, як пляннага завозу, так і мясцовай закупкі. Дзе Лесбел узяў такія зьвесткі, невядома. Толькі вядома, што даўкі пустыя і няма чым прэм'яваць возчыкаў і лесарубаў.

Лесбел груба памыляўся і дзякуючы сваёй памылцы, не дасылае належачых Слуцкаму леспрамгасу прадуктаў і прамтавараў, а гэта зрывае плян загатоўкі і вывазкі лесу і дроў.

Такое становішча, такая бясплянавая дасылка тавараў павінна быць зьнішчана.

Слуцкі леспрамгас павінен атрымаць належачыя яму прамтавары, каб выкарыстаць пляну даць належны зрух.

А. Курдо.

Выконалі толькі палову праграмы

(Гомельская сплаўная кантора)

Адным з рашаючых зьвеньняў праграмы лясной прамысловасьці зьяўляецца сплаў лесу. Ад пасьпяховага выкананьня кампаніі па сплаву залежыць і забясьпячэньне нашай прамысловасьці і гораду апалам. Праграма сплаву Сожа-Дняпроўскай сплаўканторы на 1 кастрычніка выканана толькі на 58 проц.: сплаўлена і адана дзелавой драўніны спажыўцом 392.884 куб. мэтраў. Горад забясьпечан апалам толькі на 59 проц. Дзяржпараходствам падвезена баржамі на 1 кастрычніка г г. 117.967 куб. м. Як сплаўкантора, так і Дзяржпараходства пазбаўлены магчымасьці поўнасьцю выканаць плян сплаву і баржаперавозак з-за адсутнасьці драўніны на прыстанях. Леспрамгасы: Горацкі, Чэрыкаўскі, Клімавіцкі, Чачэрскі і Гомельскі марудным тэмпамі вывазкі ставяць пад пагрозу зрыву гэтую кампанію. На 1 кастрычніка імі падвезена: дзелавой драўніны 444857 куб. м., дроў—156340, альбо 74 проц. агульнага заданьня

Нашы лесазаводы і фабрыкі ў Гомлі, Рэчыцы, Укрлеспрам, Днепрабуд і іншыя прадпрыемствы павінны яшчэ атрымаць сплавам дзелавой драўніны 278137 куб. м. і горад апалу—72713 к. мэтр.

Неабходна ўсім леспрамгасам, РВК, партыйным, камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям, у раёне якіх праходзіць сплаў і вывазка, неадкладна мабілізаваць сілы да своячасовага скончэньня сплаву. Органам РСІ патрэбна прасачыць за выкананьнем пастановы СНК СССР ад 21 верасьня 1931 г. аб своячасовым забясьпячэньні рабочых-сплаўшчыкаў харчамі і прамтаварамі, бо лесарабкопы, ня ўлічваючы важнасьці асеньняга сплаву, ня выконваюць пастанову лесасекцыі БКС аб забясьпячэньні сплаву прамтаварамі.

Ф. Каган, А. Даманаў.

Забясьпечыць пайшчыкаў дрывамі

МЕНСК. Згодна заданьня Лесбелу, у Менск штодзенна павінна прыбываць 100 вагонаў дроў. Пяць Леспрамгасаў: Бабруйскі, Асіпавіцкі, Глускі, Калінкавіцкі і Жыткавіцкі павінны даваць 35 вагонаў для МЦРК. Між тым, гэтая колькасьць ня выконваецца. МЦРК аддаецца нязначная колькасьць дроў, якія ідуць у першую чаргу на забясьпячэньне ясьляў, клінік, сталовак і г. д.

За ненармальную дастаўку дроў галоўную віну трэба ўскласьці на самыя леспрамгасы, якія мала аддаюць увагі падвозцы дроў на месца адгрузкі,—на чыгунку, якая затрымлівае падачу вагонаў, што адбіваецца перш-на перш на забясьпячэньні пайшчыкаў дровамі. За 3-ц квартал Лесбел абяцаў увесьці ў Менск 2960 вагонаў дроў, увёз-жа 830 вагонаў.

Час пакласьці канец павольным тэмпам леспрамгасаў і непаваротлівасьці чыгункі. Пайшчыкі павінны быць забясьпечаны дровамі. (Белта).

І. Гурскі

Шляхі разьвіцьця беларускага пралетарскага тэатральнага мастацтва

Рабочая кляса Беларусі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дабілася вялізарнейшых посьпехаў, як у галіне прамысловасьці, так і сельскае гаспадаркі. БССР з адсталае прыгнечанае краіны, ператвараецца ў індустрыяльна - калгасную краіну, краіну сацыяльнае пісьменнасьці, краіну высокае пралетарскае культуры. **Усё гэта зусім па новаму ставіць пытаньне мастацкага абслугоўваньня працоўных мас.**

Мастацтва і асабліва найбольш дзейсны яго від — тэатр, павінен рэгулярна ўдзельнічаць у штодзённай барацьбе пралетарыяту за пяцігодку, па вінен, усімі ўласьцівымі яму сродкамі, удзельнічаць у перабраблені псыхікі старога чалавека, падрыхтоўкі новага пакаленьня да рашаючых баёў за ідэі камунізму.

Беларускі тэатр перажыў той момант, калі ён, паасобнымі сваімі пастаноўкамі («Апраметная», «Скарына сын з Полацку», «Вір». «Тутэйшыя» і інш.) служыў нашаму клясаваму ворагу, беларускім контррэволюцыйным нацыянал дэмакратам.

Сучасны этап у галіне разьвіцьця беларускага тэатральнага мастацтва характарны радам зрухаў. Гэтыя зрухі знаходзяць сваё адбіцьцё: у актывізацыі раду беларускіх пісьменьнікаў, якія ўзяліся за напісаньне драматургічных твораў і набліжэньні да нас значнай часткі актораў, рэжысэраў, якія некаторы час былі пад уплывам нацыянал-дэмакратаў, у стварэньні (хаця не вялікіх) рэжысэрскіх кадраў вырасшых на беларускай сцэне, у зараджэньні пралетарскага сэктару беларускай савецкай драматургіі, у ачыстцы беларускае сцэны ад усяго воражага ідэолёгічна шкоднага, як «самабытнага» так і перакладнога рэпэртуару, нарэшце, у агульным мастацка-ідэйным замацаваньні рэпэртуару ўсіх тэатраў.

Мінулі тэасэзон, а таксама гастрольныя паездкі нашых тэатраў (БДТ 1, БДТ 2) у індустрыяльныя цэнтры СССР—Маскву, Ленінград, Харкаў, Кіеў, паказалі, што нашы тэатры шчыльна падыходзяць да стварэньня беларускага пралетарскага тэатмастацтва. Пры абгаварэньні ў Камакадэміі работы і шляхоў разьвіцьця аднаго з нашых тэатраў (БДТ 2), выступаючыя прамоўцы адзначылі яскравую рэвалюцыйнасьць маладога тэатру, які шчыльна падыходзіць да непасрэднага стварэньня беларускага пралетарскага мастацтва».

Аднак, хаця мы і маем некаторае прасоўваньне беларускага тэатру наперад, у сэнсе падпарадкаваньня яго работы канкрэтным задачам сацыялістычнага будаўніцтва, усё-ж задавальніцца гэтым ня можам. Беларускі тэатр яшчэ значна адстае ад запатрабаваньняў рэканструкцыйнага перыяду, асабліва ў сэнсе ідэолёгічна - мастацкае якасьці свае прадукцыі.

За годы рэвалюцыі культурны ўзровень рабочага гледача настолькі вырас, што ён, сёньня, прад'яўляе вялізарнейшы попыт на тэатральную прадукцыю ня толькі колькасную, але і якасную. Нашы тэатры ні аднаго з тэзіс зусім правільных запатрабаваньняў без карэннае рэканструкцыі свае работы ня здолеюць задаволіць. Пабудаваць тэамастацтва **нацыянальнае па форме і сацыялістычнае па сваім зьмесьце**, забясьпечыць, як колькасныя, так і якасныя паказьнікі тэамастацтва, без **арганічнае сувязі з рабочай клясай, без аўладаньня марксыцка-ленінскай тэорыяй, немажліва.** Актор, рэжысэр, драматург, увесь склад працаўнікоў тэатру, павінны быць палітычна граматнымі людзьмі, павінны быць адданымі рабочай справе.

Замацаваньне маючыхся посьпехаў, а таксама далейшае разьвіцьцё беларускага пралетарскага тэамастацтва залежыць ад наяўнасьці кадраў. Найбольш вузкім месцам разгортваньня тэатральнае справы ў БССР зьяўляецца дыспрапорцыя паміж вызначаючымся размахам тэабудаўніцтва і запатрабаваньнем на тэакадры. Становішча з тэакадрамі ў некаторай ступені служыць тормазам сацыялістычнай рэканструкцыі беларускага тэатру.

Да Кастрычнікавае рэвалюцыі і думаць нельга было аб беларускім тэатры, а сёньня, у выніку правільнага правядзеньня ленінскае нацыянальнае палітыкі, мы маем, такія мастацкія арганізмы, як БДТ 1, БДТ 2, БДЯТ, БДВТ, ЯДВТ, Польтэатр, рабочы тэатр ЦСПСБ, БДВТ саўгасных рабочых.

Акрамя гэтых ужо існуючых тэатраў з пачатку 1932 году будуць арганізаваны наступныя тэатры: БДТ III, Беларускі Экспэрымэнтальна - паказальны калгасны тэатр, два калгасныя тэатры раёнага прызначэньня, дзіцячы тэатр, беларуская эстрадная група.

Такім чынам існуючыя драмкурсы ледзь - ледзь задаволяць мінімальныя запатрабаваньні з боку існуючых тэатраў, і дадуць магчымасьць разгарнуць новыя тэатры. Патрэбна будзе і надалей захаваць гэтыя курсы, зразумела павялічыўшы кантынгент прыёму. Што да тэхнікуму сцэнічнага мастацтва, які будзе адчынены ў кастрычніку месяцы г. г., дык ён толькі праз тры гады дасьць неабходнае, добра падрыхтаванае папаўненьне. Відаць, камплектаваньне раённых тэатраў , а сёньня ўжо няма ніводнага раёну, які-б ня думаў аб сваім тэатры, прыдзецца праводзіць, галоўным чынам, за кошт тых, якія прайшлі праз драмкурсы.

А як быць з папаўненьнем стацыянарных тэатраў? Трэба будзе пайсьці па лініі прымацаваньня арганізуемых калгасных тэатраў, да стацыянарных, зрабіць калгасныя тэатры філіяламі стацыянарных беларускіх і яўрэйскага тэатру. Адзінае ідэалёгічнае мастацкае кіраўніцтва (калі пайсьці па лініі прымацаваньня), дасьць магчымасьць нармальнаму разьвіцьцю новых тэатраў. Зразумела, гэта, яшчэ канчаткова не вырашае пытаньня з кадрамі для стацыянарных тэатраў. Бліжэйшыя 2 — 3 гады пры стацыянарных тэатрах патрэбна будзе мець студыю, для прызваных рабочых ударнікаў у тэатр. Прызыў рабочых ударнікаў у тэатр трэба правесьці ўсім тэатрам, без выключэньня.

Дрэнна таксама абстаіць справа з перавыхаваньнем і пераквалфікацыяй у аднаведнасьці з марксыцка-ленінскімі ўстаноўкамі ў галіне тэатру маючыхся кадраў. Трэба, каб 1931-32 год, быў годам тэорэтычнае вучобы, годам камуністычнага выхаваньня актора. Зразумела, што перавыхаваньне актора павінна праводзіцца ў цеснай сувязі з вытворчаю работаю тэатраў.

У бліжэйшы час асноўныя індустрыяльныя цэнтры БССР—Менск, Віцебск, і Гомель будуць мець беларускія стацыянарныя тэатры, але які з трох тэатраў (БДТ 1, БДТ 2, БДТ 3), застанецца ў Менску, аб гэтым пакажа іх работа ў 1931-32 годзе. Усе гэтыя тэатры ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва, на пярышынства, павінны будуць прарабіць карэнную рэканструкцыю свае работы, дабіваючыся стварэньня высокаякаснае і ідэолёгічна - мастацкае прадукцыі.

Асноўны крытэры пры вызначэньні пяршынства, гэта ідэолёгічна мастацкая якасьць паказу, выяўленьне і распрацоўка твораў арыгінальнае беларускае пралетарскае драматургіі, высоўваньне на рэжысэрскую працу карэнных беларускіх пралетарскіх кадраў, прызыў рабочых ударнікаў у тэатр, наладжаньне арганічнае сувязі з рабочай клясай, камуністычнае выхаваньне і перавыхаваньне акторскага складу, распрацоўка пытаньня аб нацыянальнай форме і пралетарскім зьмесьце тэамастацтва, прымяненьне дыялектычнага мэтаду ў рабоце тэатраў.

БДЯТ будзе мець сталую базу ў Менску і з 1-га студзеня 1932 г. пачне працаваць у доме Культуры. Мяркуецца, што там-жа будзе працаваць ЯДВТ, як філіял БДЯТ.

Далейшае разьвіцьцё беларускага пралетарскага тэамастацтва ў значнай ступені залежыць ад наяўнасьці арыгінальнае беларускае пралетарскае драматургіі. Мы ў першую чаргу бярэм і будзем браць арыгінальны драматургічны матар'ял, гэта ня знача, што трэба браць у распрацоўку ўсё тое, што падвернецца пад руку. Нам патрэбна арыгінальная беларуская п'еса пабудаваная на матар'яле жыцьця і барацьбы рабочае клясы Беларусі, агітуючая і арганізуючая шырокія працоўныя масы на выкананьне генэральнае лініі нашае партыі, на хутчэйшую пабудову сацыялізму ў нашай краіне.

Мінулы тэасэзон ускалыхнуў пісьменьніцкія арганізацыі Беларусі. Многія з пісьменьнікаў узяліся за напісаньне п'ес, але гэта справа не такая лёгкая, ім трэба дапамагчы ў гэтай адказнай рабоце, як у сэнсе сцэнічнай апрацоўкі (прымацаваньне рэжысэраў), так і ў сэнсе стварэньня неабходных матар'яльных умоў.

Наша стаўка на арыгінальны драматургічны матар'ял, але мы бярэм і будзем браць лепшыя ўзоры расійскай, украінскай, грузінскай пралетарскай драматургіі, а таксама і іншых народаў. Гэта дасьць магчымасьць абмену культурнымі каштоўнасьцямі, азнаямленьню рабочага гледача з дасягненьнямі братніх рэспублік у галіне стварэньня пралетарскае культуры і разам усё ўзятае, прывядзе да поўнага росквіту, у пераходны пэрыяд, нацыянальнае культуры.

Неабходна таксама ўключэньне ў рэпэртуар беларускага тэатру клясчыных п'ес, але тут павінен быць асабліва крытычны падыход. Мы павінны ўзяць усё тое лепшае, што створана пры капіталізьме. Памылак у гэтым напрамку нарабілі досыць значна—іх нельга паўтараць.

Шырока разгарнуўшыйся ТРАМаўскі рух у БССР не знаходзіць належнае падтрымкі з боку цэлага раду савецкіх і прафсаюзных арганізацый. Прычыны гэтага тояцца ў тым, што адны разглядаюць ТРАМ, як экспэрымэнт: «паглядзім, што з яго выйдзе», а другія як гульню ў тэатр, трэція як школу для падрыхтоўкі акторaў для прафсыйнага тэатру. Усё гэта, бязумоўна зьяўляецца няправільным. ТРАМ зьяўляецца вышэйшай формай разьвіцьця самадзейнага мастацтва гэта праява ўдарніцтва рабочай моладзі на фронце мастацтва і па сутнасьці павінен быць вядучым атрадам у галіне мастацтва. Мы разглядаем ТРАМ як новы тып нараджаючагася, будучага сацыялістычнага тэатру. Адсюль, задача ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, усяго беларускага пралетарскага тэафронту, дапамагчы разьвіцьцю ТРАМаўскага руху ў БССР.

Створаныя Бел. ТРАМам паказы, ня гледзячы на цэлы шэраг недахопаў (стварэньне вобразу, акторскае майстэрства і інш), усё-ж зьяўляецца каштоўным укладам у беларускую пралетарскую тэакультуру. БелТРАМ, ня гледзячы на яго моладасьць, ужо ўплывае на разьвіцьцё беларускага прафсыянальнага тэамастацтва.

У Бел. ТРАМ'е, пры ўсіх яго дадатных бакох, зразумела ёсьць і адмоўнае (нікрытычнае перайманьне тэамайстэрства, ці пераняцьцьне на сцэну горшага ад аматарства), але ўсё гэта лёгка паправімае і зьяўляецца нічым іншым, як цяжкасьцямі вялікага росту.

Менскі яўрэйскі ТРАМ, Гомельскі, Віцебскі, і Полацкі ТРАМ'ы зьяўляюцца маладым мастацкім арганізмам і патрабуюць ад ТРАМ'аўскага савету штодзённага кіраўніцтва. На жаль, гэтага няма. Трэба , каб камсамольскія арганізацыі заняліся гэтым пытаньнем.

Разьвіцьцё беларускага пралетарскага тэамастацтва, яго карэнная рэканструкцыя, залежыць ад разгортваньня ТРАМ'аўскага руху. Пры складаньні каштарысаў на 1931 год, ТРАМ'ы наркамфінаўцамі выкрэсьлены з дзяржаўнага бюджэту, гэтая-ж патроза маецца і на 1932 год; усё гэта бязумоўна гаворыць аб недаацэнцы ТРАМ'аўскага руху, нявер'і ў маж лівасьць рабочае моладзі стварэньня сапраўды пралетарскага тэамастацтва.

У галіне разгортваньня самадзейнага мастацтва і да сёньняшняга дню амаль ніхто не займаецца. Дзесяткі соцен самадзейных гурткоў прадстаўлены самі сабе. Няма адзінага мэтадычнага цэнтру — дому самадзейнага мастацтва, няма неабходнай колькасьці кіраўнікоў самадзейных гурткоў, няма адпаведнай драматургіі і іншай літаратуры па самадзейнаму мастацтву, няма спэцыяльнага часопісу па мастацтву, праз які магчыма было-б кіраваць гэтай надзвычай на адказнай работай у галіне культурнага будаўніцтва. Усё гэта прымушае біць трывогу. Трэба зрабіць рашучы пералом у гэтай рабоце, заставіць пал'трпасьвет працаўнікоў раёну, загадчыкаў дамоў сацкультуры, клюбаў, садзейнічаць разгортваньню работы па самадзейнаму мастацтву, з другога боку неабходна даць драматургічны матар'ял, падрыхтаваць неабходную колькасьць кіраўнікоў драмгурткоў, адчыніць цэнтральны дом самадзейнага мастацтва, дабіцца выданьня спэцыяльнага часопісу.

Упяршыню ў БССР, у 1932 годзе, будзе арганізаваны дзіцячы тэатр, задачай яго зьяўляецца, камуністычнае выхаваньне падрастаючага пакаленьня. Справа гэтая ў БССР новая, а таму, на гэты тэатр трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Патрэбна будзе для гэтае работы прыцягнуць пэдагогаў, пэдалёгаў, лепшых мастакоў, рэжысэраў. Камсамол, піянэрскія арганізацыі павінны будуць праводзіць штодзенае кіраўніцтва работай гэтага тэатру.

Што да рэпэртуару дзіцячага тэатру, дык тут неабходна будзе прыцягнуць пісьменьніцкія арганізацыі Беларусі і ў першую чаргу БелАППП, для манага дзіцячага паказу.

Разгортваньне беларускага пралетарскага тэамастацтва цесна зьвязана з капітальным будаўніцтвам. Зараз у БССР будуюцца тэатры ў Бабруйску і Оршы. Вясною 1932 году разгорнецца будаўніцтва ў Менску новага вялікага тэатру на 2.500 месц. Тэатр будзе будавацца на пляцу Парыскай камуны. Акрамя гэтага вядзецца падрыхтоўчая работа будаўніцтва тэатру ў Гомелі разьлічанага на 2.000 месц. Трэба таксама будаваць ваньне з боку рабочага гледача, на гэты від відовішча, надзвычайна вялікае.

Пры будаўніцтве ў раёнах дамоў сацкультуры, а таксама ў гарадох клюбаў, трэба ўлічваць пабудову неабходных сцэнічных пляцовак, адказваючых запатрабаваньням сучаснай тэатэхнікі, а

Да справазлачнай кампаніі

МАСАВЫ АГЛЯД работы САВЕТАЎ

Праз пяць дзён пачынаецца споваздачная кампанія саветаў

Ператворым сельскія саветы ў сапраўды бальшавіцкія штабы кіраўніцтва сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі

Два прыклады

Прэзыдыум ЦВК СССР ў сваёй пастанове ад 25 студзеня 1930 г. аб новых задачах саветаў вызначыў што «масавая калектывізацыя, вялізная сацыялістычная перабудова дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак, рашучая палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, ставяць па новаму пытанне аб рабоце ўсёй вязвой сеткі саветаў і падымаюць іх работу на вышэйшую ступень»

і далей:

«Сельсавет, які не перабудуе сваёй работы прыстасоўна да новых задач у сувязі з масавай калектывізацыяй і не стане на чале калгаснага руху, будзе на справе кулацкім сельсаветам, няздольным праводзіць партыйку сацыялістычнага будаўніцтва».

Гэтыя палажэньні некаторыя сельсаветы не разумеюць. Прыклад апартуністычнай практыкі, патураньні кулаку, паказвае работа Пагарэльскага сельсавету, Асіпавіцкага раёну на чале з падкулачнікам Ваўчком. Сваім патураньнем кулаком гэты сельскі савет пайшоў па шляху зрыву ўмацаваньня калгасу «Камунар».

Зусім інакш падышоў да гэтай справы Загаранскі сельсавет, Шклоўскага раёну, які сапраўды стаў штабам калектывізацыі.

Ніводнага паседжаньня сельскага савету не праходзіць без таго, каб не разьбіраць канкрэтныя жыцьцёвыя пытаньні таго ці іншага калгасу, яго арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне. Сельскі савет калектывізаван на 98 проц.

Па Загаранскім сельсавеце трэба раўняцца. Што-ж да кіраўніцтва Пагарэльскага сельсавету, то яго месца на лаве падсудных.

Ударнай работай зноў заваяваць пяршынства

БАБРУЙСК (наш кар.). Яшчэ ня так даўно **Броскі сельсавет**, Бабруйскага раёну, быў адным з перадавых сельсаветаў па ўсіх галінах сваёй работы. Умела паставіўшы работу з беднатой ён здолеў дабіцца значных вынікаў у калектывізацыі, уцягнуўшы ў калгасы 60 проц. бядняцка-сераднякога сялянства сельсавету.

Але апошні час Броскі сельсавет надзвычайна мала аддаваў увагі арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў, пераводу іх на зьдзельшчыну, правільнай арганізацыі працы і вучоту яе, мала цікавіўся іх унутраным жыцьцём; калгасы сельсавету маюць рад глыбокіх прарываў.

Вынікам гэтай апартуністычнай бязьдзейнасьці з боку сельскага савету і партыйнай арганізацыі зьяўляецца тое, што ні ў адным з 6 калгасаў сельсавету ня ўведзена зьдзельшчына. Па калгасах існуе падзёншчына, кулацкая ўраўнілаўка. Калгас «Праўда» спрабаваў перайсьці на зьдзельшчыну, але яму ніхто ў гэтым не дапамог і карысная справа не прышчапілася.

З вучотам працы ў калгасах справа стаіць надзвычайна дрэнна. Па некаторых калгасах у гэтым пытаньні ёсьць шмат недарэчнасьцяй (калгас «Новае Жыцьцё»). Яшчэ да гэтага часу некаторыя калгасы сельсавету не абагулілі сваёй рабочай жывёлы.

Гэтая бязьдзейнасьць сельскага савету ў пытаньнях замацаваньня калгасу прывяла да таго, што ў апошні час калгас «Праўда» правёў яўна кулацкае разьмеркаваньне авансаў бульбы, ня ўлічваючы выпрацаваных працадзён і не ствараючы насеннага фонду.

Па радзе калгасаў нават не прапрацавана пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні ўраджаю. Арганізацыя малочных фэрм праводзіцца чарапашымі тэмпамі.

У выніку апартуністычнага кіраўніцтва сельскага савету і партыйнай ячэйкі зрываецца рад кампаній: ў калгасе «Праўда», яшчэ ня скончана ўборка 5 га сенажаці, зяблівае ворыва адно што пачалося, значна зацягнулася асеньняя сяўба.

Работа з беднатой праводзіцца слаба. Групы беднаты распаліся. Калгасы засьмечаны клясава-варожым элемэнтам.

Усе гэтыя факты павінны паслужыць сыгналам Броскаму сельсавету для рашучага павароту тварам да калгаснага будаўніцтва, да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Апартуністычная бязьдзейнасьць у гэтым пытаньні, якая панае ў практыцы Броскага сельсавету, павінна быць вырвана з карэньнем.

Броскі сельсавет, які быў у радох першых сельсаветаў у раёне, ударнай работай павінен заваяваць зноў гэтае пяршынство.

А. Дамброўскі.

Загаранскі сельсавет—кіраўнік калгаснага руху

ШКЛОЎ (наш кар.). Загаранскі сельсавет суцэльная калектывізацыя. На сёньняшні дзень сельсавет калектывізаваны на 98 проц. Каля 600 бядняцка сераднякіх гаспадарак—у калгасах. Усяго на тэрыторыі сельсавету арганізована 13 калгасаў, з якіх самыя буйныя «Ясная паляна», з 130 гаспадарак з плошчаю 1900 га, «Іскра»—105 бядняцка-сераднякіх гаспадарак і «Воля»—70 гаспадарак.

Галоўная ўвага партыйнай ячэйкі і сельскага савету разам з калгасным актывам, пасьля арганізацыі калгасаў, была зьвернута на арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне апошніх. Зьдзельшчына і вучот працы ў калгасах была ўведзена з самага пачатку веснавой сяўбы. Кожны калгаснік мае на руках кніжку, дзе запісваюцца выпрацаваныя ім дні.

Дзякуючы гэтаму калгасы Загаранішчыны справіліся своячасова з сяўбою і ўборкай ўраджаю.

Узаемная дапамога калгас-калгасу шырока ўжывалася у Загаранскім сельсавеце. Старшыня калгасу —«Іскра», т. Босаў так і заявіў на нарадзе пры сельсавеце: «прарыў ў адным з калгасаў, гэта прарыў у сельскім савеце, гэта прарыў у раёне». Патрэбна узаемная дапамога ў ліквідацыі прарыву.

Як-жа сельсавет кіруе калгасамі?

Старшыня і сакратар сельсавету калгаснікі, якія бачаць недахопы і практычна іх зьнішчаюць.

На кожным паседжаньні прэзыдыуму сельсавету абгаварваюцца справаздачы альбо інфармацыя таго ці іншага калгасу, вызначаюцца практычныя мерапрыемствы па палепшаньні той ці іншай галіны работы. На пленум сельскага савету заўсёды запрашаюцца старшыні калгасаў. Разам з імі абгаворваюцца пытаньні аб уборцы ураджаю, арганізацыі працы ў калгасах, разьмеркаваньні ўраджаю і г. д. Апроч гэтага пры сельсавеце адбываюцца спэцыяльныя нарады старшынь калгасаў.

Для набліжэньня сваёй работы да шырокіх колаў выбаршчыкаў прэзыдыум сельскага савету свае паседжаньні пераносіў ў асобныя калгасы, там-жа заслухоўваліся справаздачы старшынь калгасаў. Гэта ў значнай ступені падымала актыўнасьць калгаснікаў на выкананьне ўсіх палітычна-гаспадарчых задач.

Добра наладжаная работа сельсавету дала адпаведныя вынікі. Калгасы Загаранскага сельсавету з посьпехам скончылі ўборку і здалі свае лішкі дзяржаве на 300 проц. звыш пляну.

Плян мабілізацыі грашовых сродак з кварталу выкананы на 100 проц. Значныя посьпехі маюцца яшчэ таму, што партыйная ячэйка і сельсавет згрупавалі вакол сябе і ўцягнулі ў работу шырокі актыў. Усялякія ўдарныя кампаніі сельсавет праводзіць праз брыгады, якія арганізуюцца пры сельсавеце з лепшых калгаснікаў, камсамольцаў і настаўнікаў.

Але побач са значнымі посьпехамі Загаранскі сельсавет мае недахопы.

Асноўным недахопам зьяўляецца недастатковае кіраўніцтва культурным будаўніцтвам. Загаранскі сельсавет вельмі позна пачаў рамонт школ чым адцягнуў на 10 дзён заняткі ў 7-годны і ШКМ, ня ўсе школы забясьпечаны апалам, не арганізованы лікпункты пры калгасах і г. д.

Дрэнна таксама ідзе будаўніцтва сьвінарнікаў у калгасах «Іскра» і «Ясная паляна», а часу ўжо засталося вельмі мала. Будаўніцтва сьвінарнікаў трэба фарсаваць.

Сельсавет мала зьвярнуў увагі на безгаспадарчасьць у некаторых калгасах.

Вось тыя асноўныя недахопы, якія патрэбна зараз-жа зьнішчыць мабілізаваўшы на гэту справу шырокія масы калгаснікаў і культурныя сілы.

Г. Ш.

В ро ніцкі сельсавет уключыўся ў агляд

Вароніцкі сельсавет, Полацкага раёну, уключыўся ў правядзеньне агляду работы і справаздачнай кампаніі саветаў. З гэтай мэтай арганізавана 9 брыгад, якія ахопяць усе вучасткі работы сельсавету. Акрамя гэтага па ўсіх населеных пунктах адбываюцца сходы, на якіх, па прынцыпе добраахвотнасьці, вярбуюцца калгасы, аднаасобнікі і служачыя ў тую ці іншую брыгаду па іх жаданьні.

Я. Зорны.

Кіраўніцтва Пагарэльскага сельсавету і калгасу „Камунар" у кулацкім палоне

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, арганізацыя бядняцка-сераднякіх мас на разгортваньне калгаснага руху, і на барацьбу з кулацтвам, ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, своячасовае і чоткае правядзеньне гаспадарча - палітычных кампаній, разгортваньне вакол усяго гэтага масавай работы—вось асноўныя задачы, якія ў сучасны момант стаяць перад саветамі.

Як-жа спраўляецца з гэтымі задачамі Пагарэльскі сельсавет, Асіпавіцкага раёну?

Тыя факты, якія выявіла наша брыгада толькі ў некаторых населеных пунктах сельсавету ўжо гавораць аб тым, што сельсавет з гэтымі задачамі ня справіўся і ня здолеў іх ажыцьцявіць.

У пытаньні арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў сельсавет абсалютна нічога не зрабіў. Прыклад: калгас «Камунар», які арганізаваўся вясной гэтага году патрабаваў гаспадарчага ўмацаваньня, але-ж сельсавет яму нічым не дапамог. Старшыня сельсавету Ваўчок песна зьвязаўся з кулакамі і праводзіць шкодную работу.

Так, пры дапамозе Ваўчка кулак Рэдэс разбазарыў сваю маёмасьць і пад відам малазаможнага, уступіў у калгас. Пры дапамозе таго-ж Ваўчка ў калгас пралез яшчэ рад кулакоў (Кашэль, Булавацкі і інш.).

Старшыня сельсавету не адзін раз наладжваў п'янкі з кулакамі. Да гэтага часу кулакі яшчэ ня выкналі абавязковых плацяжоў і цьвёрдых заданьняў. Кулак Рэдэс яшчэ ня выплаціў сельгаспадатку звыш 200 рублёў, тое-ж зрабілі і кулакі Бараноўскі Булавацкі, Кашэль і іншыя.

У час арганізацыі калгасу «Камунар» кулакі спрабавалі сарваць яго, а калі батракі і беднякі цьвёрда сталі на шлях арганізацыі калгасу і пачалі яго афармляць, дык група кулакоў бачачы, што калгас будзе арганізаваны і іх антысавецкая агітацыя правалілася, парашыла ўступіць у калгас, з мэтай падарваць яго з сярэдзіны.

У час выбараў праўленьня калгасу «Камунар» гэтая-ж група кулакоў з'агітавала батракоў і беднату на тое, каб іх (кулакоў) абралі ў праўленьне. Ім удалося дасягнуць гэтай мэты. Старшынёй калгасу зьяўляецца Блізьнец, сваяк гэтых кулакоў, які праводзіць адну з імі лінію.

Перш за ўсё яны павялі рашучую барацьбу супроць беднаты і батракоў. Яны на кожным кроку імкнуліся выжыць з калгасу беднякоў і батракоў. Бывалі выпадкі, што старшыня калгасу Блізьнец гнаў з работы батрачак і голасна заяўляў, што «беднота і батракі ня здольны працаваць».

Аднойчы ён заявіў: «ня месца батраком і беднаце ў калгасе, я вас сашлю на Салаўкі». Батрачку т. Тамашэвіч Блізьнец (старшыня калгасу) прагнаў з работы толькі за тое, што яна ня выйшла на работу, калі ў яе захварэла дзіця.

У той-жа час жонкі кулакоў зусім на работу ня выходзяць, а Блізьнец нічога ня робіць, каб прымусіць іх працаваць.

Кулакі зрываюць абагульваньне кароў. Нават старшыня калгасу Блізьнец, які мае тры каровы, ідзе супроць абагульваньня кароў. Загадчык гаспадаркай кулак Кашэль пазьбіраў лепшы інвэнтар і схаваў яго. Ён нават і так зрабіў: лепшую шыну з калёс садраў і асадзіў на свае калёсы.

Коняй бедняком Блізьнец не дае, а сам, з членамі праўленьня, езьдзіць куды хоча. Быў такі выпадак, калі ў бяднячцы т. Воранавай захварэла дзіця і яна папрасіла каня, каб завезьці дзіця ў больніцу, дык старшыня каня ня даў, а сам у той-жа дзень паехаў на фэст у м. Сьвіслачы, дзе прабыў тры дні. У гэты-ж час калгаснікі ня выходзілі на работу, бо старшыня калгасу паляводам ня даў нарадаў.

На 25 верасьня яшчэ ня была засеяна і палова азімыны, ня было ўбрана 5 га аўсу, толькі напалову выкананы плян па сіласаваньні.

У калгасе няма вучоту працы. Старшыня калгасу запісвае сваім сваяком працадні хоць яны і ня выходзілі на работу. Зьдзельшчына ў калгасе ня ўведзена.

Пры Пагарэльскім сельсавеце ёсьць партыйная і камсамольская ячэйкі, але-ж яны ніводнага разу не паклікаліся работай калгасу «Камунар». Партыйчэйка ня кіруе работай сельсавету. Асобныя партыйцы і камсамольцы ведаюць, у якім становішчы знаходзіцца калгас «Камунар», але-ж ні адзін з іх ня ўзьняў гэтага пытаньня на актыўных сходах ячэек.

Таксама з боку райкалгассаюзу ня было зьвернута належнай увагі на калгас «Камунар». Сюды ніводнага разу не зьяўляўся агранам. Ні сельсавет, ні райкалгассаюз не праверылі клясавага складу калгасу, не пацікавіліся хто ў калгасе «Камунар» стаіць на чале кіраўніцтва.

Асіпавіцкаму райкалгассаюзу трэба безадкладна выправіць дапушчаныя памылкі.

Ёсьць яшчэ рад фактаў, якія з усёй рашучасьцю гавораць аб тым, што Пагарэльскі сельсавет, а ў прыватнасьці старшыня Ваўчок мае цесную сувязь з кулакамі, ня здольны выконваць тых задач, якія стаяць у сучасны момант перад сельсаветам.

РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ павінны адпаведным чынам рэагаваць на бязьдзейнасьць партыйнай і камсамольскай ячэек.

Трэба рашуча ўдарыць па кулацкім кіраўніцтве Пагарэльскага сельсавету і ачысьціць яго ад варожых элемэнтаў.

Мы лічым неабходным каб Асіпавіцкая райпракуратура больш дэталёва высьветліла факты дзейнасьці Пагарэльскага сельсавету і кулакоў у калгасе «Камунар» і прыцягнула іх да адказнасьці.

Выязная брыгада газэты «Савецкая Беларусь» на лесараспрацоўках: **Касьцюк, Басько, Ермакоў, Ладуцька і Крупіч.**

Сустрэнем XIV Кастрычнік

поўным выкананьнем плянаў збожжазагатовак

„Загатоўкі застаюцца і ў гэтым годзе адным з рашаючых вучасткаў клясавай барацьбы на вёсцы. Кулацтва будзе спрабаваць перашкаджаць баявым тэмпам загатовак, а таму на барацьбу супроць кулацтва павінна быць мабілізавана ўся партыйная, камсамольская, прафсаюзная, калгасная і бядняцка-сераднякая маса".
(З пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб разгортваньні масавай работы вакол загатовак)

Поўнасьцю ліквідаваць самацёк у збожжазагатоўчай кампаніі

Да суровай адказнасьці

кулакоў, якія зрываюць арганізацыю чырвоных абозаў

Недапушчальна марудна праходзяць збожжазагатоўкі па Вушацкім раёне. На 5 кастрычніка раённы плян збожжазагатовак выкананы толькі на 19 проц.

У паасобных сельсаветах загатоўкі ідуць зусім слабымі тэмпамі, напрыклад Чарапоўшчынскі сельсавет выканаў толькі 1 проц., пляну, Плінскі—4 проц., Жарскі—7,9 проц.

У некаторых сельсаветах заўважаецца простае патураньне кулаку у збожжазагатоўках. Цьвёрдыя заданьні па збожжазагатоўкам кулацка-заможнай часткай выкананы толькі на 30 проц.

У радзе месц кулакі адкрыта агітуюць супроць загатовак. Напрыклад у М.-Данецкім с.-савеце калгаснікі калгасу «Чырвоная кветка» дагаварыліся чырвоным абозам везьці збожжа на загатоўчы пункт. Гэта пачуў кулак Міхаль. Праз свайго актыўнага агента падкулачніка Мацюша ён так павёў работу, што сарваў арганізацыю чырвонага абозу.

Між тым належнага адпору яму ніхто ня даў.

Тое-ж самае адбылося і ў Весьніцкім сельсавеце, дзе кулакі Азевіч і Клачок сарвалі сход па збожжазагатоўках.

Трэба адзначыць, што партыйныя і камсамольскія ячэйкі раёну яшчэ недастаткова зразумелі палітычна-гаспадарчую важнасьць збожжазагатовак. Арганізацыя чырвоных абозаў, за рэдкімі выключэньнямі, амаль што не практыкуецца. Між тым, гэта-б значна ўзьняло калгаснікаў і бядняцка-сераднякую частку аднаасобнікаў па выкананьні збожжазагатовак.

Калгасы ў збожжазагатоўках ганебна адстаюць. Плян збожжазагатовак калгасамі выкананы толькі на 14 пр. Такое адставаньне трэба тлумачыць толькі бязьдзейнасьцю старшынь калгасаў і райкалгассаюзу.

Карцель Ільля.

Аршаншчына павінна дабіцца крутога пералому ў збожжазагатоўках

Ворша. (Наш. кар.). На 10 кастрычніка плян збожжазагатовак па Аршанскім раёне выкананы на 36,3 проц. Лічба—зусім ганебная. Паводле дырэктыў партыі і ўраду яшчэ на 1 кастрычніка павінна быць выкананна ня менш 50 проц. гадавога пляну збожжазагатовак.

Здавалася-б, што ў кастрычніку месяцы на Аршаншчыне павінен быць абавязковы зрух у збожжазагатоўках з тым, каб у кастрычніку ня толькі на вярстаць упушчанае, але яшчэ і перавыканаць заданьне.

З боку райвыканкому і райкому партыі былі ўжыты адпаведныя захады па ўзмацненьні тэмпаў збожжазагатовак, нават быў абвешчаны конкурс на лепшае выкананьне пляну. Аднак замест узмацненьня збожжазагатоўкі ў кастрычніку месяцы яшчэ больш зьнізіліся. Калі на 1 кастрычніка плян збожжазагатовак быў выкананы па раёне на 32 проц., дык на 5 кастрычніка процант выкананьня павялічыўся толькі да 34,4 проц. А за апошнюю пяцідзёнку (з 5 па 10 кастрычніка) загатоўлена 68 тон збожжа.

Слабае нарастаньне тэмпаў збожжа загатовак у кастрычніку тлумачыцца тым, што ў гэтай справе з боку шмат якіх сельпо і сельсаветаў пануе стаўка на самацёк. Тут атрымалася як раз тое, аб чым папярэджвала партыя яшчэ перад пачаткам збожжазагатоўчай кампаніі: Асобныя сельсаветы, сельпо і партыйныя ячэйкі парашылі, што сярод калгаснікаў няма чаго праводзіць масавую работу па збожжазагатоўках, што калгасы і самі здадуць дзяржаве маючыяся ў іх лішкі збожжа. Гэта прывяло да таго, што калгасы Аршанскага раёну ня сталі ў першых радох здатчыкаў, а наадварот цягнуцца ў хвасьце аднаасобнікаў.

За гэта кажа прыклад хаця-б апошняй пяцідзёнкі, калі з 68 тон загатоўленага збожжа, калгасамі здадзена толькі 15 тон. Райкалгассаюз і большасьць праўленьняў калгасаў недаацэньваюць справу збожжазагатовак, як адну з важнейшых гаспадарча палітычных кампаній.

Ня менш важнай прычынай ганебных прарываў у збожжазагатоўках на Аршаншчыне зьяўляецца адсутнасьць з боку большасьці сельсаветаў і сельпо належнага націску на кулака і заможніка якім дадзены цьвёрдыя заданьні па загатоўках, адсутнасьць кантролю за выкананьнем гэтых заданьняў. Сельпо і сельсаветы ня маюць належнага ўліку кулацка-заможных гаспадарак і не даюць поўных зьвестак аб выкананьні гэтымі гаспадаркамі цьвёрдых заданьняў.

Гэтыя недахопы ў далейшым не ў якім разе ня могуць быць дапушчаны. Райспажыўсаюз, райкалгассаюз, сельпарткомы, сельсаветы, сельпо і праўленьні калгасаў пад кіраўніцтвам партячэек павінны перабудаваць сваю работу ў бок бальшавіцкага фарсаваньня тэмпаў збожжазагатовак. На гэта павінны быць мабілізаваны ўсе сілы і сродкі.

Трэба разгарнуць масавую растлумачальную і арганізацыйную работу сярод калгаснікаў і бядняцка-сераднякай часткі аднаасобнікаў, прымусіць кулака і заможніка выканаць цьвёрдыя заданьні і такім чынам дабіцца таго, каб кожная пяцідзёнка давала ўсё большае і большае нарастаньне тэмпаў загатовак і забясьпечвала-б бальшавіцкае выкананьне пляну.

А. Кудрын.

Патрэбны рашучы пералом

Сянно, 5. Выкананьне пляну збожжа загатовак па Сеньненшчыне праходзіць нездавальняюча. Дырэктыва партыі і ўраду аб тым, што 1 кастрычніка павінна быць выкананна ня менш 50 проц. гадавога пляну збожжазагатовак Сеньненскім раёнам ня выканана.

На 5 кастрычніка плян збожжазагатовак выканан усяго на 41,4 проц. Паасобныя сельсаветы, дзякуючы слабага разгорнутай растлумачальнай і арганізацыйнай рабоце загатоўчых арганізацый, партыйных і камсамольскіх ячэек, ганебна плятуцца ў хвасьце збожжазагатовак. Напрыклад: Застадольскі сельсавет выканаў гадовы плян усяго на 17 проц., Хадчанскі—на 23 проц., Гарывецкі—на 25 проц.

Адначасова з гэтым рад сельсаветаў у рыніку сапраўды ўдарнай работы па правядзеньні збожжазагатовак дабіўся вялікіх посьпехаў у гэтым на прамку. Так, па Сеньненскім гарсавеце гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 78 проц., па Нямайцянскім сельсавеце на 63 проц.

Выкананьне гадовага пляну збожжазагатовак кулацка-заможнай часткай складае 33 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што у Сеньненскім раёне яшчэ недастаткова націскаюць на кулака у спагнаньні з яго цьвёрдых заданьняў.

У некаторых сельсаветах, напрыклад у Застадольскім, гадавы плян па цьвёрдых заданьнях на 5 кастрычніка выканан усяго на 14 проц., у Гарывецкім—на 16 проц., Машчанскім—на 15 проц., Пустынскім на 2 проц., Буцкім—15 проц.

Гэтыя сельсаветы яўна прымірэнча адносяцца да кулакоў ў правядзеньні кампаніі збожжазагатовак.

Тэмпы збожжазагатовак Сеньненскі раён павінен рашуча ўзмацніць. Трэба больш націскаць на кулака і прымусіць яго зараз-жа выканаць цьвёрдыя заданьні па збожжазагатоўках.

Б. Знаёмы.

Дабіцца зруху

Збожжазагатоўкі па **Княжацкім** сельсавеце, **Шклоўскага** раёну, праходзяць зусім марудныя тэмпамі. Сельсавет і партячэйка ў гэтым напрамку амаль нічога ня робяць, а сельпо нават ня ведае, як праходзяць загатоўкі і як выконваецца плян загатовак.

Цьвёрдыя заданьні з кулацка - заможнага элемэнту не спаганяюцца. Камісія садзейнасьці загатоўкам таксама нічога ня робіць, каб прасунуць выкананьне пляну ўперад.

А. Г.

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне Сакратара РК КП(б)Б тав. Вашкевіча і садклад інструктара ЦК тав. Галодка аб ходзе сяўбы, уборкі ўраджаю, зяблівага ворыва, нарыхтовак і аблаканьня сельска - гаспадарчым падаткам па Асьвейскім раёне ЦК КП(б)Б адзначае, што ня гледзячы на шэраг дасягненьняў у рабоце партарганізацыі (калектывізавана звыш 52 проц. гаспадарак раёну, маецца машынна-трактарная станцыя) РК КП(б)Б ня здолеў па сапраўднаму мабілізаваць партыйную камсамольскую, прафсаюзную арганізацыі і актыўнасьць калгаснікаў і ад наасобнікаў беднякоў і сераднякоў на вакол пасьпяховага правядзеньня гэтых кампаній.

Райкамарт ня здолеў папярэдзіць і сам дапускаў грубыя скрыўленьні лініі партыі ў раёне, як то: недаацэнку і ігнараваньне кіраўніцтва сяўбою і ўборкай па аднаасобным сэктары «левацкія» перагібы да сераднякі, выразіўшыяся ў байкоце прамтаварамі праз каапэрацыю, масавым давядзеньнем цьвёрдых заданьняў да сераднякі, ад міністраваньні да яго, ігнараваньні на становы аб аслабаненьні ад хлебазадачы бядняцка-сераднякіх гаспадарак і калгасаў засеяўшых ня менш 10—15 пр. пасеўнай плошчы пад лёнам. Пры чым гэтыя «левацкія» справы перапляталіся з права-апартуністычнымі папусьціцельствамі да кулакоў пралезшых у калгасы для падрыўнай працы, да выяўленьня кулацка-заможных гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня і дачы цьвёрдых заданьняў і спагнаньня з іх прылічваючыхся плацяжоў.

Побач з гэтым прарывы і значнае адставаньне ў правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній у раёне тлумачыцца:

а) апартуністычнай недаацэнкай і спадзяваньне на самацёк з боку зямельных, калгасных, каапэрацыйных, і МТС арганізацый, няўменьнем РК мабілізаваць партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя і калгасных масы навакол правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній і выцягаючым адсюль вельмі слабым спалучэньнем уборкі ўраджаю з асноўнымі кампаніямі — пасеўнай, зяблівай і нарыхтовачнай.

б) Слабай арганізацыяй працы у калгасах (ураўнілаўка ў працы і разьмер каваньні авансаў, адсутнасьць рэальных рабочых пляноў, і норм выпрацоўкі ва многіх калгасах, з 62 калгасаў пераведзена на зьдзельшчыну 12, адсутнасьць сацспаборніцтва, ударніцтва сустрэчных пляноў у калгасах і г. д.).

в) Недастатковым апэрацыйным і тэхнічным кіраўніцтвам сяўбою і ўборкай з боку Райкалгассаюзу і МТС, не правільным і няпоўным скарыстаньнем наяўных сіл і сродкаў раёну. (Рабочай сілы калгасаў, трактароў, машын, інвэнтара).

г) Яўным ігнараваньнем жывой цягавай сілы. (Трактары скарыстоўваюцца на баранаваньні ў той час, калі коні ў калгасах гуляюць, а таксама на зябу коні зусім не скарыстоўваюцца).

Выходзячы з гэтага ЦК пастанаўляе: 1. За дапушчэньне права-апартуністычнага прарыву ў правядзеньні важнейшых гаспадарча - палітычных кампаній у раёне, у барацьбе з кулаком, і «левацкіх» перагібаў у адносінах да сераднякі ў паасобных зьвенях Райпарторганізацыі і савецкага апарату — зьняць з працы членаў бюро РК т. т. Зайцава, Восіпава, Стрыжакова, Меерзона — былога сакратара РК, зьняць з пасады загадчыка Аргінстру Жлобінскага РК. Справу аб прыцягненьні да партыйнай адказнасьці гэтых таварышоў перадаць у ЦКК. Старшыню РВК тав. Грынкевіча пачаўшага актыўна выпраўляць свае памылкі заставіць на працы. Паводзіны тав. Галаўнёва былога загадчыка Аргінстру РК, высьвятліць коскму складу РК і паведаміць аб гэтым ЦКК.

2. Накіраваць т. Фарберава, Юзенко, Гагаліка, Сьліжакова для ўзмацненьня Райпарткіраўніцтва, а т.т. Адаменка, Селяха, Шпунтава, Жэлезьнякова, Лесіна, Барынбаўма і Кулакчова—для узмацненьня савецкага, каапэрацыйнага і калгаснага кіраўніцтва раёну і прапанаваць пералічаным таварышам выехаць у 3-х дзённы тэрмін у Асьвейскі раён.

Абавязаць ЦК ЛКСМБ у 5-ці дзённы тэрмін укамплектаваць працаўнікамі Асьвейскі РК ЛКСМБ накіраваўшы ня менш 3-х чалавек, Наркамасьветы далаць 4-х настаўнікаў і 4-х загадчыкаў хаты-чытальні.

3. Прыняць да ведама заяву т. Рэвінскага, што з боку ЦКК КП(б)Б будзе праведзена абсьледваньне працы Асьвейскай РКК-РСІ.

Прапанаваць Асьвейскаму Райкому сканцэнтраваць усю ўвагу партыйнай арганізацыі на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, як на задачы цэнтральнай у галіне калгаснага будаўніцтва.

4. Прапанаваць РК КП(б)Б і РКК у самы карацейшы тэрмін самым рашучым чынам на справе выправіць грубейшыя праваапартуністычныя памылкі, дапушчаныя з боку РК і паасобных зьвеўняў райпартарганізацыі і савецкага апарату, павысіць кляса вую пільнасьць ячэек і барацьбу на два фронты—правым апартунізмам як самым небясьпечным, з усёй рашучасьцю ўдарыць па «левацкіх» перагібах.

Адобрыць прынятыя мерапрыемствы з боку РК па выпраўленьні дапушчаных памылак (байкоту, дачы цьвёрдых заданьняў сераднякам, недаацэнкі аднаасобнага сэктару, недаабложэньня кулакоў і г. д.).

5. На падставе шырока разгорнутай масавай растлумачальнай працы, шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сустрэчных пляноў, сацыялістычнай узаемадапамогі і грамадзкага буксіру перадавых калгасаў адстаючым — мабілізаваць калгаснае масы і аднаасобнікаў сераднякоў і беднякоў для выкананьня і перавыкананьня пляну нарыхтовак, азімай сяўбы, зяблявага ворыва, сілсаваньня, уборкі бульбы і папярэдняй апрацоўкі лёну. Пераключыць увесь трактарны парк і значную колькасьць жывой цягавай сілы калгасаў на зяблявае ворыва.

6. З мэтай эканамічнага ўзмацненьня раёну і скарыстаньня маючыхся цалінных зямель і прыродных багацьцяў (азёр) прапанаваць Наркамзему у месячны тэрмін узмацніць і пашырыць існуючы ў раёне саўгас, арганізаваць новы ільнаводчы саўгас на маючыхся цалінных землях і запаснага фонду, а таксама адстанавіць возера «Асьвея» маючае вялікае рыбнае, птушкаводнае і сплаўнае значэньне.

7. Адзначаючы недапушчальны факт што да апошняга часу пастанова ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, СНК СССР і БССР аб жывёлагадоўлі не прапрацавана ў раёне і практычныя мерапрыемствы ў раённым разрэзе не намечаны, будаўніцтва і камплектаваньне таварных фэрм праходзіць нездавальняюча (выкананна ня больш як на 60 проц.), прапанаваць РК мабілізаваць партарганізацыю і калгаснікаў на ліквідацыю гэтага прарыву ў самы карацейшы тэрмін, зьвярнуўшы ўвагу на выкананьне пляну сілосу.

8. РК разгарнуць шырокую працу па вырашчваньню кадраў з актывістаў-калгаснікаў, арганізаваць да вясеньняй кампаніі сець курсаў і школ па падрыхтоўцы брыгадзіраў, вучотчыкаў, паляводаў і жывёлаводаў, а з мэтай масавай ліквідацыі палітычнай і агратэхнічнай няпісьменнасьці, арганізаваць пры кожнай сямігодцы вячэрнія калгасныя школы, для моладзі і дарослых, уцягнуўшы ў іх значную колькасьць калгаснікаў. СНК і Наркамасьветы разгледзець заяўку і адпусьціць сродкі на гэтую справу Асьвейскаму раёну.

9. Улічваючы, што перабудова партпрацы тварам да калгаснага будаўніцтва ўсё яшчэ не праведзена, ЦК прапануе Асьвейскаму РК у месячны тэрмін перабудаваць сець вясковых ячэек па вытворчым прынцыпе (арганізацыя ячэек пры калгасах) сканцэнтраваўшы ўвагу на задачах узмацненьня і пашырэньня калгасаў, падрыхтоўкі да разьмеркаваньня даходаў, у асаблівасьці на задачах арганізацыі працы, усямерна ўзмацніць працу па арганізацыі беднаты, па выхаваньню ўсёй масы калгаснікаў у барацьбе з кулацкімі настроямі і імкненьнямі ў калгасах — (паядоцкім разьмеркаваньнем даходаў, падворным разьмеркаваньнем кармоў, ураўнілаўкай, мінімалісцкімі нормамі выпрацоўкі, пагрозамі адходнікам, нежаданьню працаваць зьдзельна і г. д.).

Арганізаваць пры кожным калгасе камсамольскія ячэйкі, узмацніць прыём у партыю з шэрагаў камсамолу і мабілізаваць камсамольскія ячэйкі для больш актыўнага ўдзелу ў правядзімых гаспадарча-палітычных кампаніях.

Да пленуму ЦК КП(б)Б

НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ,

ліквідацыяй прарываў, перапаўненьнем радоў партыі сустракаюць чыгуначнікі пленум ЦК КП(б)Б

73 ударнікі Аршанскага чыгуначнага вузла падалі заявы ў партыю. 25 лепшых ударнікаў Віцебскага чыгуначнага вузла перадаюцца ў партыю. Камсамольцы вузла арганізавалі 2 паравозныя брыгады

Прастой вагонаў па віне Саюзтрансу

На гародняй базе МЦРК на сёньняшні дзень выгружана каля 40 вагонаў бульбы, капусты, бручкі і інш. гародніны, большая частка гэтых вагонаў стаіць ужо 3 дзень і не выгружаецца. Вінавайцай гэтага зьяўляецца Саюзтранс, які не паклапаціўся аб тым, каб мець патрэбную колькасьць грузчыкаў для выгрузкі вагонаў. І гэта ў той час, калі ёсьць пастанова ўраду аб тым, што выгрузка павінна праводзіцца на працягу 3-х гадзін. Але на вялікі жаль, гэта пастанова ня выконваецца, хоць цяпер адчуваецца недахват у пустых вагонах для перавозкі хлеба, гародніны і дроў.

Хто павінен адказваць за гэты недапушчальны прастой вагонаў па 2-3 дні?

Вінавайцы гэтых прастояў павінны адказаць перад пралетарскім судом.

Брыгадзір газ. «Сав. Бел.» РОЗЕС.

Кліентура зрывае перавозкі

Бабруйск. 14-X. (Белта). Падрыхтоўка да асеньня-зімовых перавозак на станцыі Бабруйск праходзіць нездавальняюча. Плян перавозак ня выконваецца. Мясцовая кліентура часта вымяняе свае заяўкі. Саюзхлеб мяняў сваю заяўку чатыры разы, а ў выніку работа для разгрузачна-пагрузачных работ заставалася не скарыстанай. Мясцовай кліентурай грузы выкупаюцца і вывозяцца не своячасова. На станцыі гніе 12 вагонаў яблык, якія належаць фабрыцы «Чырвоны харчавік».

Пагрузка да гэтага часу не пераведзена на гаспадарчы разьлік. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўжываецца фармальна. Культмасавая работа разгорнута слаба, нават няма ленінскага кутка.

Такое становішча зьяўляецца вынікам слабай і недастатковай працы партыйна-камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый станцыі.

Падрыхтоўка да пленуму ЦК выклікала нябывалы ўздым

ВОРША. 10-га кастрычніка адбыўся сход чыгуначнікаў Аршанскага вузла, пр

За бесьперабойнае фінансаваньне сацыялістычнага будаўніцтва

ВУЧЫЦЕСЯ У ВАРАШЫЛАУЦАУ
як трэба змагацца за фінплян

ДА 14-й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ—ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫВЫ НА ФІНАНСАВЫМ ФРОНЦЕ

Варашылаўцы бяруць на грамадзкі буксір

у мабілізацыі сродкаў заводаў „Камунар" і „Дрэвааапрацоўшчык"

Да фінішу правадзімай па БССР фінэстафэты прыйсьці першымі абавязваюцца рабочыя і адміністрацыйна тэхнічны пэрсанал заводу імя Варашылава. Зараз на заводзе разгорнута вялікая работа па фінэстафэце. У справе выкананьня фінпляну рабочы калектыў заводу ўвесь час ідзе ў першых радох толькі дзякуючы таму, што гэтаму вучастку работы партыйны і камсамольскі калектывы надаюць належную ўвагу. Добра працуе заводскі камсод за што прэміраван Цэнтральнай камісіяй садзейнасьці дзяржкрэдыту на 750 руб. Кантрольная ліньба па пазыцы 3 рашаючага выканана, і аформлена ў суме 105.765 руб.

На перадзе па фінэстафэце ідзе мадэльны цэх, усе рабочыя цэху зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы, на 100 проц. ахоплены рабочыя цэху пазыкай «3-рашаючага» на поўны месяц ны заработак, апроч гэтага арганізавалі грамадзкую праверку ўплаты паёў у ЗРК.

Ганебна адстае ліцэйны цэх, у якім старшыня цэхкамітэту т. Шкляр ня толькі ня прымае ўдзелу ў фінэстафэце, а наадварот сваёю дзейнасьцю зрывае ў сябе ў цэху гэта мерапрыёмства.

Ня гледзячы на значныя посьпехі ў справе мабілізацыі вольных сродкаў працоўных, калектыву заводу імя Варашылава на сёньняшні дзень мае яшчэ недахопы.

Да гэтага часу яшчэ да 100 рабочых неахоплены пазыкай 3 рашаючага, нявыкананы кантрольныя ліньбы ў 2 і 3 квартале па ўкладах у ашчадкасу, не наладжана праверка ўплаты і спагнаньня паявых узносаў. Каапбюро ў зборы паявых узносаў нічога ня рабіла і ня робіць.

Канчаткова ліквідаваць маючыяся прарывы ў выкананьні фінпляну да кастрычнікаўскіх сьвят—абавязаліся рабочыя заводу. Варашылаўцы абавязваліся практычна праз пасылку сваёй брыгады дапамагчы ў ліквідацыі прарыву па мабілізацыі сродкаў у падшэфным Грычынскім сельсавеце.

Узяты на грамадзкі буксір па мабілізацыі сродкаў заводы «Камунар» і «Дрэвааапрацоўшчык», куды варашылаўцы вылучылі і паслалі для практычнай дапамогі свае рабочыя брыгады.

Варашылаўцы пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву будуць змагацца па баявому за выкананьне фінпляну як за адзін з магутных сродкаў у справе хутчэйшага пуску «518» і «1040».

В.

Абвяшчаем сябе мабілізаванымі на выкананьне фінпляну

Да куставых нарад к раўнікоў і плянавікоў Дзяржбанку і да ўсіх работнікаў фінансава-банкаўскай сыстэмы БССР

Працоўныя Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў, дабіліся вялізарных дасягненьняў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Пралетарыят Савецкага саюзу пераможна завяршае будаўніцтва фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, уваходзяць у строй 518 новых фабрык і заводаў, арганізуюцца 1040 машынна - трактарных станцый, больш паловы бядняцка - серадняцкіх гаспадарак калектывізаваны. На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя апора капіталізму ўнутры краіны—кулацтва.

Гэтыя посьпехі будаўніцтва сацыялізму грунтуюцца на творчым энтузіязьме рабочае клясы, які разгортваецца ў штодзённай барацьбе за генэральную лінію партыі на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Новыя ўмовы і новыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад работнікаў фінансава - банкаўскіх устаноў каб яны працавалі і кіравалі па новаму для поўнага выкананьня задач IV кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі і рашучай мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці на лепшае выкананьне задач 4-га заключнага году пяцігодкі.

Пасьпяховае выкананьне шырачэйшай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва ў значнай ступені залежыць ад пасьпяховага выкананьня адзінага фінансавага пляну і пляну мабілізацыі сродкаў, а таму:

Куставая нарада кіраўнікоў і плянавікоў наступных філіялаў Дзяржбанку: Бялыніцкага, Горацкага, Дубровенскага, Клімавіцкага, Касьцюковіцкага, Крычаўскага, Магілеўскага, Мсьціслаўскага, Аршанскага, Рагачэўскага Стара-Быхаўскага, Чавускага, Чэрыкаўскага, Шклоўскага у гор. Магілеве абвяшчае сябе мабілізаванымі па выкананьні фінпляну і пляну мабілізацыі сродкаў у 4-м квартале 3-га рашаючага году пяцігодкі, паставіўшы перад савой мэту поўнага і датэрміновага выкананьня гэтых пляноў, па ўсіх паказьніках да 20 сьнежня бяг. году, і ня менш 50 проц. пляну да дню 14 гадавіны Кастрычнікаўскай рэвалюцыі і заклікае усе правадзімыя Усебелканторай Дзяржбанку куставыя нарады ў Віцебску, Гомелі, Бабруйску, і Менску, па бальшавіцку, у сваёй штодзённай рабоце, змагацца за поўнае і датэрміновае выкананьне фінпляну, мабілізаваўшы вакол гэтага пытаньня ўсю фінансава - банкаўскую грамадзкасьць і наогул працоўную масу раёну, укараняючы на практыцы ленінскія мэтады работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, якія павінны забясьпечыць выкананьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач перад фінансава - банкаўскай сыстэмай.

Адначасова ставім перад НКФ і Белканторай Дзяржбанку задачу свая часовага і сыстэматычнага асьвятленьня ходу выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў у друку, каб мець магчымасьць лепшым браць на грамадзкі буксір адстаючых.

Па даручэньні куставой нарады
Шэрман, Кайкоў, І. Гаўрусеў.

Ельскі леспрамгас зрывае мабілізацыю сродкаў

Прыцягнуць вінаватых да адказнасьці

Плян мабілізацыі сродкаў у Ельскім раёне за першы квартал выканан на 100 проц., у другім на 28,7 проц., і ў трэцім на 76,8 проц. Выкананьне фінпляну ў першым квартале ў адносінах другога і трэцяга кварталу, сьведчыць аб паслабленьні тэмпаў на гэтым вучастку работы.

Рад раённых і мясцовых арганізацый і ў першую чаргу фінансавыя агідна адносяцца да мабілізацыі сродкаў, яны гэтую работу не паставілі ў цэнтр ўвагі ў сваёй штодзённай рабоце.

Абавязковыя плацяжы нават па першым ўзносе, тэрмін якога прайшоў даўно поўнасьцю не спагнаны. Так па сельгаспадатку плян выкананя усяго на 52,7 проц., па страхоўцы—44,4 проц. і па самаабкладаньні—10,3 проц.

Рад сельсаветаў у адносінах да спагнаньня абавязковых плацяжоў асаблівая з кулацка-заможных гаспадарак праявілі поўную бязьдзейнасьць. Так Кармянскі сельсавет па селгаспадатку спагнаў 31 проц., па страхоўцы—32,5 проц. і па самаабкладаньні—1 проц., Рамезаўскі сельсавет па сельгаспадатку — 30,8 проц., па страхоўцы—32,6 проц. і па самаабкладаньні—21,5 проц. і інш.

Ашчадкасы адыгрываюць вялікую ролю ў справе мабілізацыі сродкаў, але ў Ельскім раёне яны паказваюць ганебныя паказьнікі работы. Па раёне за III квартал замест прыліву ўкладчыкаў меўся значны адліў. Гэты адліў складае 8523 рублёў. Апарат ашчадкас ня здольны справіцца з пастаўленымі задачамі перад ім.

Рэалізацыя пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі праходзіць вельмі марудна. Аб гэтым яскрава сьведчыць процант выкананьня. На 1 кастрычніка плян выкананя усяго на 8,9 проц. Раённыя ўстановы і мясцовыя грамадзкія арганізацыі ў гэтым пытаньні злосна бязьдзейнічаюць.

Інспэктар фінаддзелу РВК пры праверцы як установы мабілізуюць сродкі выявіў, што леспрамгас утрымаў падаходныя падаткі ад рабочых і служачых свае ўстановы і ў банк гэтых грошай ня здаў. За леспрамгасам лічыцца запазычанасьць за аблігацыі па пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» на суму 1185 рублёў і па аблігацыях пазыкі другога выпуску 1005 руб. Пасьля выяўленьня гэтых агідных фактаў справа была перададзена міліцыі, але-ж апошняя і да гэтага часу ня ўжыла ніякіх мер.

Адпаведным органам трэба леспрамгас прыцягнуць да судовай адказнасьці за зрыў мабілізацыі сродкаў.

Трэба мабілізаваць усю грамадзкасьць на ліквідацыю прарыву на фінансавым фронце.

Невядомскі.

Кулацкі агент Будрык

разбурае калгас

У калгасе «Перамога». Княжыцкага сельсавету, Шклоўскага раёну, поўная безгаспадарчасьць. Кароўнік яшчэ не пабудаваны ня гледзячы на тое, што лес з Шклоўскага лясьніцтва быў адпушчан аж у красавіку.

Азімая сяўба і ворыва пад зяб зацягваюцца, копка бульбы яшчэ не пачата.

Разьмеркаваньне ўраджаю праводзіцца мэтадам кулацкай ураўнілаўкі. Зьдзельшчына ігнаруецца самім праўленьнем. Старшыня калгасу Будрык сваёй бязьдзейнасьцю прыводзіць калгас да распаду.

Будрык забясьпечвае прадуктамі і прамтаварамі кулакоў, з якімі ён п'янствуе, а бедняцкі Юханавай, якая пасе кароў, Будрык не дае абутку і прадуктаў.

Шклоўскі райкалгасаюз не зварочвае на работу гэтага калгасу абсалютна ніякай увагі.

А. Г.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Пра зьмену п. «а» арт. 100 крымінальнага кодэксу.

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР за 20 ліпеня 1931 г. «Пра адказнасьць за парушэньне правіл падліку аўтамота-транспарту», ЦВК і СНК БССР пастанаўляюць: запісаць п. «а» арт. 100 Крымінальнага Кодэксу ў наступнай рэдакцыі:

«100. а) Парушэньне правіл пра ваенны падлік рабочай жывёлы (коняй, валоў), павозак, зброі, аўтамабіляў, матацыклаў, вэлёсыпэдаў і іншых транспартных сродкаў, якія належаць да ваеннага падліку, а таксама пра ваенны падлік прылад і запасных частак да іх і непаданьне іх бяз важных прычын для перападліку, перапісу і для спробных альбо праверачных мабілізацый выклікаюць—штраф да двухсот рублёў альбо прымусовыя работы да аднаго месяца».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.

в. аб Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

5 кастрычніка 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Пра скасаваньне арт. арт. 3 і 4 і зьмену арт. 5 пастановы ЦВК і СНК БССР «пра парадак скліканьня зьездаў і нарад».

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Скасаваць арт. арт. 3 і 4 сваёй пастановы за 17 лістапада 1929 г. «Пра парадак скліканьня зьездаў і нарад» (З. З. БССР 1929 г. № 40, паст. 231).

2. Артыкул 5 памянёнай пастановы запісаць у наступнай рэдакцыі:

«Раённыя зьезды і нарады могуць скліканца грамадзкімі і каапэрацыйнымі арганізацыямі толькі з дазволу раённай рабоча-сялянскай інспэкцыі».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.

в. аб Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

5 кастрычніка 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Пра дапаўненьне арт. 23 пастановы пра абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў і саветаў і пра парадак накладаньня адміністрацыйных спагнаньняў п. «у».

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР за 20-7 1931 г. «Пра адказнасьць за парушэньне правіл падліку аўта—мота—транспарту», ЦВК і СНК БССР пастанаўляюць дапоўніць арт. 23 пастановы ЦВК і СНК БССР за 15 мая 1931 г. «Пра абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў і саветаў і пра парадак накладаньня адміністрацыйных спагнаньняў» (З. З. БССР 1931 г., № 19, паст. 156) а. «у» у наступнай рэдакцыі:

«у) за парушэньне правіл падліку аўта-мота-транспарту, калі няма адзнакаў сацыяльна-небясьпечнага дзеяньня, прадугледжанага п. «а» арт. 100 Крымінальнага Кодэксу».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.

в. аб Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

5 кастрычніка 1931 г.
г. Менск.

Да XIV гадавіны Кастрычніка
абавязуемся ліквідаваць усе прарывы

Да ўсіх рабочых дрэвааапрацоўчай прамысловасьці Беларусі

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе ЦК, мы ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Мы ўступілі ў апошні квартал году завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Рад важнейшых галін нашай прамысловасьці, як электрычная, нафтавая, а па Беларусі — шэйная, ужо выканалі сваю пяцігодку. У гэты час дрэвааапрацоўчая прамысловасьць, у прыватнасьці, Бабруйскі дрэвааапрацоўчы камбінат і наш беларэўны цэх у асаблівасьці, ня выходзіць з палясы ганебных прарываў.

Асноўнай прычынай гэтых прарываў, як гэта правільна адзначыў ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце белцэху, зьяўляецца: «недастатковая перабудова партыйна - прафсаюзнай і гаспадарчай работы слабое разьвіцьцё сацспаборніцтва і ўдарніцтва і ўлік яго эфэктыўнасьці, наяўнасьць настрояў аб'ектыўшчыны і раўнаньня на вузкія месцы. Перавод цэху на гаспадарчы разьлік (праведзены фармальна); адзінаначальле яшчэ не зрабілася асноўным у рабоце цэху, прагрэсыўна - прэміяльная сыстэма фактычна не праведзена, мае яшчэ месца абязьлічка. Няма дастатковай увагі да культурна - бытавога аслугоўваньня рабочых».

Усё гэта яскрава сьведчыць аб тым, што мы яшчэ не ўзяліся па-сапраўднаму за рэалізацыю 6 задач пастаўленых тав. Сталіным, за работу па-новаму, не забясьпечылі поўнага выкананьня экспартнага пляну.

Мы цьвёрда парашылі пакончыць з ганебным адставаньнем

Мы ня можам дапусьціць, каб на фоне пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва мы зьяўляліся ганебнай плямай. Мы абавязуемся:

1. Шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж зьменамі, брыгадамі і ўнутры брыгад, зрабіўшы цэх да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі цалкам ударным.

2. Да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі скончыць поўны перавод усіх брыгад, зьмен і ўсяго цэху на гаспадарчы разьлік.

3. Замацаваць прэміяльна - прагрэсыўную зьдзельшчыну, якая зараз уведзена ў цэху.

4. Перабудаваць усю партыйна-прафэсыянальную работу, пераносячы ўвесь цэнтр у групу, брыгаду і варштаты.

5. У мэтах хутчэйшага аўладаньня вэнны Кастрычніцкай рэвалюцыі ня менш 16 гурткоў, арганізаваць да гэтага-ж часу курсы брыгадзіраў і варштатнікаў.

6. Увесьці ў фонд XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ня менш 100 рабочых прапаноў. Перабудаваць усю работу БРІЗ у сэнсе ўстанаўленьня самай цеснай сувязі ў яго рабоце з вытворчымі нарадамі. ІТР цэху бяруць на сябе абавязак стаць на чале разгортваньня і дапамогі ў хутчэйшым разглядзе рабочых прапаноў і рэалізацыі прынятых.

7. Канчаткова ліквідаваць абязьлічку ў цэху.

8. Да XIV гадавіны перадаць у партыю лепшых рабочых - ударнікаў і акамсамоліць увесь цэх. Уцягнуць у прафсаюз 100 проц. рабочых. Ахапіць партвучобай 100 проц. партыйцаў і камсамольцаў і ня менш 50 пр. беспартыйных рабочых.

9. Перабудаваць усю сваю работу пачынаючы ад цэху да варштату, разгарнуць зьменна - сустрэчныя пляны.

10. Да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выканаць ня менш 50 проц. квартальнага пляну па экспорце.

11. Ператварыць цэхавую сталоўку ва ўзорны цэх вытворчасьці.

12. Забясьпечыць выпуск штодзённых газэт у кожнай брыгадзе.

13. Цалкам падрыхтаваць цэх да зімовага пэрыяду

Для забясьпечаньня выкананьня ўзятых намі абавязацельстваў мы патрабуем:

Ад заводакіраўніцтва камбінату: 1. Своечасовага і поўнага давядзеньня да цэху ўсіх паказьнікаў па прамфінпляне і калькуляцыі. 2. Абсталяваньня для цэху пляцоўкі і забясьпечаньня яго ня менш, чым двухдзённым запасам добраякаснай сыравіны, згодна новых тэхнічных умоў Экспертлесу. 3. Забясьпечаньня цэху дастатковай колькасьцю пары і электраэнэргіі. 4. Выканаць пастанову ЦК КП(б)Б аб поўным забясьпечаньні цэху рабсілай, асабліва кваліфікаванай. 5. Забясьпечыць цэх струментамі для рэзкі. 6. Выканаць пастанову ЦК КП(б)Б аб забясьпечаньні рабочых кватэрамі і аб своечасовым сканчэньні пабудовы клюбу.

Ад фанцэху: 1. Забясьпечыць цэх ня менш чым аднадзённым добраякаснай фанэры, згодна новых тэхнічных умоў Экспертлесу.

Ад трэсту Дрэўпром: 1. Забясьпечыць цэх аўтавозам, грузавіком і 2 электраваганэткамі. 2. Рэалізаваць пастанову аКмісіі выкананьня пры СНК БССР аб перадачы цэху фрэзэрнага варштату па мэталю. 3. Паскорыць пабудову на камбінаце ў гэтым годзе ўтылізацыйнага цэху.

Ад машынабудаўнічага заводу імя Сталіна: 1. Хутчэйшага выкананьня заказаў, якія пераданы яму камбінатам.

Мы выклікаем фанцэх і лесцэх камбінату

на сацспаборніцтва па лепшым выкананьні экспартнага пляну і на лепшую падрыхтоўку да сьвяткаваньня 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Мы заклікаем усіх рабочых дрэвааапрацоўчай прамысловасьці БССР

па бальшавіцку ліквідаваць усе прарывы, да XIV гадавіны Кастрычніка выканаць ня менш 50 процантаў квартальнага пляну.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, ідучы па шляху, які паказаў тав. Сталін у яго прамове на нарадзе гаспадарнікаў, цалкам рэалізаваўшы пастанову ЦК КП(б)Б, мы пераможам.

Вылучаем у якасьці арбітраў па сацспаборніцтву раённую газэту «Камуніст», завадзкую шматтыражку «За ўдарны тэмпы» і газэту «Савецкая Беларусь».

Рабочыя, адм. - тэх. пэрсанал і служачыя Беларэўнага цэху Бабруйскага камбінату.

Адозва абгаворана і прынята на сходах усіх зьмен цэху:

Беларэўны цэх павінен стаць перадовым

(Бабруйскі дрэвааапрацоўчы камбінат)

Чамусьці беларэўны лічыцца цэхам. У сапраўднасьці гэта значны завод з цалкам закончаным працэсам вытворчасьці.

На гэтым заводзе працуе каля 900 рабочых.

Ужо больш году, як цэх поўнасьцю разгарнуў сваю работу і ўсё-ж ён яшчэ не пакончыў з «дзіцячымі хваробамі».

На 1-га кастрычніка цэх выканаў сваю гадавую праграму толькі на 35 проц., а па экспарту—на 54,9 проц. За першую дэкаду кастрычніка агульны цэхавы плян выкаран на 95,4 проц., а экспартны плян толькі на 63,9 проц.

Асноўныя прычыны гэтых прарываў яскрава адзначаны ў пастанове ЦК КП(б)Б ад 12 верасьня. ЦК КП(б)Б карстатаваў адсутнічаньне ў цэху пе рабудовы партыйна-масавай работы, фармальны перавод на гаспадарчы разьлік, наяўнасьць настрояў аб'ектыўшчыны і раўнаньня на вузкія месцы, слабасьць адзінаначальля, наяўнасьць абязьлічкі, адсутнасьць прэміяльна-прагрэсыўнай зьдзельшчыны і адсутнасьць увагі да культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых.

Трэба сказаць, што дырэктыва ЦК КП(б)Б наконт выпраўленьня недахопаў ні адміністрацыяй, ні цэхавымі арганізацыямі цалкам яшчэ ня выканана. Не перабудавана яшчэ масавая работа, не перабудавана работа вытворчых нарад. На сёньняшні дзень на гаспадарчы разьлік пераведзены толькі 1 раскройная брыгада, прычым і гэта эроблена чыста фармальна: адміністрацыя ня выконвае свайго абавязацельства аб прадстаўленьні брыгадзе якасных паказьнікаў выкананьня прамфінпляну, аб абсталяваньні спэцыяльных скрынак для хаваньня інструменту і змазачных матар'ялаў.

У цэху не адчуваецца поўнага адзінаначальля, асабліва з боку нізавога адмтэхнэрсаналу, майстраў і брыгадзіраў. Ёсьць выпадкі, калі рабочы ат рымлівае адразу распараджэньні і ад вышэйшага і ад сярэднягa пэрсаналу. У шмат якіх выпадках зварочваюцца да цэхавай адміністрацыі, абмінаючы брыгадзіраў і майстраў. Не здала яшчэ сваіх пазіцый абязьлічка, асабліва ў сушыльным аддзяленьні, якое, да рэчы кажучы, зьяўляецца адным з самых адсталых вучасткаў.

Фармальна заводакіраўніцтва абавязалася забясьпечыць цэх добраякаснай сыравінай. Заводакіраўніцтва абавязалася да 10 кастрычніка перанесьці рас кроечную яно абавязалася даць цэху добраякасную фанэру для фялёнт.

Шмат чаго абавязалася заводакіраўніцтва, але ні аднаго з гэтых абавязкаў заводакіраўніцтва ня выконвае. Цэх працягвае забясьпечвацца сыравінай, не заўсёды адпавядаючай свайму прызначэньню і не ў дастатковай колькасьці. Асабліва дрэнна забясьпечваецца цэх як колькасна, так і якасна фанэрай, ня гледзячы на наяўнасьць на аллегласьці сотні мэтраў фанэрнага цэху.

Пераабстляваньне раскроечнай толькі пачынаецца і невядома калі будзе скончана.

Цэх цьвёрда парашыў пакончыць з гэтымі прарывамі. На агульных сходах зьмен, рабочыя далі абавязацельствы цалкам ліквідаваць прарывы, 14 гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі спаткаць выкананьнем ня менш 50 процантаў квартальнага пляну па экспарце і поўнай перабудовай партыйна-прафсаюзнай работы.

Абавязацельства дадзена. Перад рабочымі, ІТР і ўсім калектывам беларэўнага цэху стаіць баявая задача—пад аднаўленым кіраўніцтвам цэхавай партарганізацыі, цалкам, па-бальшавіку абавязацельствы выканаць, зьняць з цэху ганебную пляму адстаючага.

А. Камбінацкі.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

17 кастрычніка—усебеларуская нарада рэдактароў

17-га кастрычніка г. г. у памяшканні Малой Залі ЦК Культпропам ЦК КП(б)Б склікаецца Усебеларуская нарада рэдактароў цэнтральных, гарадзкіх і раённых газэт БССР з абавязковым удзелам усіх камуністых-работнікаў цэнтральных газэт, рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражных газэт гор. Менску і студэнтаў гаэтнага аддзяленьня Камвузу ім. «Леніна».

Абвестка дню:

1. Уступная прамова Сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча.
2. Перавыбары парторганаў і задачы цэнтральнага і раённага друку (дакл. т. Гурэвіч).
3. Паведамленьні рэдактароў усіх цэнтральных і раённых газэт аб ходзе організацыі штодзённых насьцэнгазэт і аб канкрэтнай дапамозе ім з боку рэдакцыі.

На нараду выклікаюцца рэдактары наступных гарадзкіх і раённых газэт: Гомель, Віцебск, Бабруйск, Барысаў, Рэчыца, Магілёў, Полацк, Слуцк, Ворша, Дуброўна, Лёзна, Шклоў, Будка-Кашалёва, Жлобін, Крычаў, Рагачэў, Чэрвень, Бягомль, Койданава, Лагойск Горкі, Старыя Дарогі, Плешчаніцы, Камарына, Мазыр, Петрыкаў, Пухавічы, Старобін, Чураў, Чырвоная Слабада, Гарадок, Талочына.

Пачатак нарады — роўна а 5-ай гадз. увечары (рэгістрацыя за 30 хв. да пачатку паседжаньня).

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

КІНО-ПАЛАЦ КУЛЬТУРА — Усходн. савецк. фільм УЗДЫМ. Звыш праграмы: Сталінградзкі Трактарны. Пач. а 7 г.

КІНОТЭАТР НАЦЫЯНАЛ — 2 фільмы ў 1 сэанс 1. Дзеньнік адной камуны 2. Чарлі Чаплін у тэатры. Працуе з 12 гадз. дня

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ" — Мастацкі фільм КАПРЫЗ КАЦЯРЫНЫ. Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз. дня

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Дуглас Фэрбенкс ЗЫН ЗОРА. Пачатак а 7, 8,45 і 10,30. Каса ад 5 г.

МЕНСКІ БЕЛАРУСКІ ПЭДАГАГІЧНЫ ТЭХНІКУМ —) паведамляе, (— што прыём заяў на АДНАГАДОВЫЯ ПЭДКУРСЫ пры тэхнікуме працягнуты да 25 кастрычніка. Прымаюцца скончыўшыя 7-годкі або адпаведныя ім навучальныя ўстановы на умовах абвешчаных у даведніку НКА. Адрас: г. Менск, Савецкая 107.

Мен. гар. КК-РСІ і рэдакцыя газэты „Рабочий" паведамляюць, што 16 кастрычніка г. г., а 6 гадз. увечары ў памяшканьні рэдакцыі газ. „Рабочий"
СКЛІКАЕЦЦА ПАШЫРАНАЯ НАРАДА
3-хкутнікаў менскіх прадпрыемстваў, прадстаўнікоў Абкамтрэсту, Унівэрсытэцкага гарадка, Дому Селяніна, 67-кватэрнага дому, рацыяналізатары прадпрыемстваў і рабкоры-ударнікі менскіх прадпрыемстваў па пытаньні правядзеньня 3-хмесячніка барацьбы за эканомію топліва
З прычыны важнасьці пытаньня—яўка ўсіх абавязкова
Мен.гар. КК КП(б)Б
Рэдакцыя газэты „Рабочий"

„САЮЗСЕЛЬЭЛЕКТРА"
АБВЯШЧАЕ НАБОР
у школу вучнёўства па электрыфікацыі сельскай гаспадаркі (электрасельвуч) у г. Менску.
Курс навучаньня паўтара гады. Патрэбна адукацыя за 4-х годку і ўзрост ад 16 год. Школа рыхтуе электрамацёраў. Вучні атрымліваюць стыпэндыю (52 руб. 25 к. у месяц).
Заявы са спраўкай аб адукацыі і соцпаходжаньні падаваць да 25-га кастрычніка на адрас: Менск, Савецкая, № 68. Дом Пісьменьніка Загадчыку сэкт. кадраў В. Залуцкаму.
БЕЛКАНТОРА САЮЗСЕЛЬЭЛЕКТРА
Загадчык сэктару кадраў ЗАЛУЦКІ

15-X 1931 г. праводзіцца
сталінскі штурмавы суботнік
чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў
гор. Менску і ваколіц.
Збор а 7 гадзіне раніцы на Пляцу Волі.
Яўка ўсіх партызан і чырвонагвардзейцаў, непрацаваўшых 10-X абавязкова і без спазьненьня.
Начальнік штабу штурму па ліквідацыі прарываў Ярашоў.

Менгарком КП(б)Б разам з Гарсаветам
СКЛІКАЮЦЬ НАРАДУ
на 15 кастрычніка, а 12 гадз. дня ў памяшк. Гаркому
сэкратароў сельпарткомаў, сельячэек КП(б)Б І СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ.
Яўка абавязкова.
Менгарком КП(б)Б
Менгарсавет

УСЕБЕЛАРУСКІ
Дзяржаўны Палітыка-Асьветны Тэхнікум
у г. Магілеве (Камсамольская, 28)
ПРАВОДЗІЦЬ НАБОР НА ПЕРШЫ КУРС
ЗАВОЧНАГА СЭКТАРУ,
на аддзяленьне: масавае і бібліятэчнае
Кантынгент набору 100 чалавек: на масавае, палітыка-асьветнае аддзяленьні, на белсэктар 40 чал., яўсэктар—20 чал., польсэктар 15 чал., і на бібліятэчнае аддзяленьне 25 чал.
Прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б і ЛКСМ, беспартыйныя рабочыя, калгаснікі, бядняцка-серадняцкі актыў па камандыроўцы райкомаў КП(б)Б для партыйцаў і комсамольцаў і РВК для беспартыйных, якія маюць веды ў абёме сямігодкі.
Кожны райком і гарком КП(б)Б мае згодна разьверстцы—ня менш 3 месц.
Дакументы прадстаўляць згодна правіл прыёму ў тэхнікум.
Апошні тэрмін прадстаўленьня заяў 15 лістапада.
Дырэктар КАПАЕВІЧ.

МЕНСКІ ЗАВОЧНЫ БЕЛПЭДТЭХНІКУМ
прымае заявы ад грамадзян
наступных раёнаў:
Менскага, Лагойскага, Койданаўскага, Заслаўскага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага, Вузьдзенскага, Асіпавіцкага, Бабруйскага з г. Бабруйскам.
Заявы накіроўваць па адрасу: Менск, Савецкая 107, завочны Белпэдтэхнікум.

ГУБЛЕНЫ

Пропуск на [illegible] цягі на імя [illegible] сельсавету, выдан Менскім заводам цягі, квіт. 431-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні Бялынкавіцкай сямігодкі [illegible] Касьцюковіцкага раёну, на імя [illegible] А. Д., квіт. 891-п.

Ашчадная кніжка за № 353 па ўкладу № 92 на швэймашыну Малашчэнка Я., квіт. 885-п.

Вайсковы білет Пугачова І., выд. Жлобінскім райваенкаматам, квіт. 892-п.

Асабовае пасьведчаньне і іншыя дакумэнты на імя Алексеява П., квіт. 897-п.

Вайсковы білет і асабовае пасьведчаньне Паляева Н. П., квіт. 898-п.

Сяброўскі білет Саюзу працасьветы Пастушонак Г., квіт. 899-п.

Сяброўскі білет Саюзу Працасьветы Токарскай А., квіт. 900-п.

Сяброўскі білет № 892 Антонава Міхася, выд. саюзам працасьветы, квіт. 903-п.

Вайсковая кніжка Жадзько П. А., выд. Заблітоўскім РВК (Амурскай вобласьці), квіт. 904-п.

Сяброўская кніжка № 25991 Мажэйка Н. А., выд. Калінкавіцкім спажыў. т-вам, квіт. 905-п.

Паявая кніжка Клеўка Л. М., выд. Пухавіцкім райспаж. саюзам за № 1597-12181, квіт. 907-п.

Білет ЛКСМБ за № 167012 Пятухова В. Я., выд. Вульскім РК ЛКСМБ, квіт. 908-п.

Членскі саюзны білет за № 52-361278 Герасімчук М. С., выд. саюзам будаўнікоў, квіт. 909-п.

Конская вучотная картка за № 590 Бабрупка К. С., выд. Каралінскім ваенкаматам, квіт. 910-п.

Мэтрычная даведка Лук'янава В. П., выд. Ельскім РВК, квіт. 911-п.

Паявая кніжка за № 894 Лехтаровай Е., квіт. 912-п.

Конская вучотная картка № 1015 Батракова Я. Р., выд. Халопенцкім РВК, квіт. 913-п.

Конская вучотная картка за № 4034 Самаца Ф., квіт. 914-п.

Каапэрацыйная кніжка № 3434 Каўшара І., выд. Азарыцкім спаж. т-вам, квіт. 916-п.

Пасьведчаньне аб скончэньні 2-х месячных курсаў мастаўшчыкоў пры 7-й дыстанцыі 3-га дарожн. будаўн., Назарчука І. А., выд. 7-й дыстанцыяй, квіт. 917-п.

Вайсковы білет Гохмана А. Ш., выд. Ельскім РВК і камсамольскі білет выд. Мазырскім акружкомам ЛКСМ, квіт. 918-п.

Вайсковая кніжка Кущова І. Н., выд. Жлобінскім РВК, квіт. 919-п.

Паявая кніжка № 773 Мельнікова А., выд. Бярэзінскім спаж. т-вам, квіт. 921-п.

Партбілет, пасьведчаньне аб праве нашэньня зброі, сяброўскі білет Працасьветы, пасьведчаньне аб скончэньні Камвузу на імя Бурко Г. Г. квіт. 922-п.

Вайсковая кніжка Ганчарова К. М., выд. Жлобінскім РВК, квіт. 924-п.

Вайсковы білет Ціракова І. І., выд. Круглянскім РВК, квіт. 925-п.

Вайсковы білет Кротова С. В., выд. Круглянскім РВК, квіт 925-п.

Вучотна конская картка Тузова, А., выд. Круглянскім РВК, квіт. 825-п.

Паявая кніжка Бярозскі М., выд. Круглянскім Райспажыўсаюзам, квіт. 925-п.

Камсамольскі білет Шэўчанкі С., выд. Круглянскім РК ЛКСМ, квіт. 925-п.

Пашпарт Макарэнка З. С., выд. Ветрынскім сельсаветам гарадж. 1910 г., квіт. 884-п.

Гадавы пашпарт за № 54 Піскуновай О. І., квіт. 886-п.

Білет, выд. Саюзам Прац. зямлі і лесу на імя Лапета К. Я., квіт. 887-п.

Конская картка Шэцька А. Д., выд. Ельскім РВК, квіт. 890-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-73, сэктараў —3-15. Выдавецтва—2-44. Выпускаючага 12-65 (два званкі)

Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

ПРЭЗІДЭН